WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 МАЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 99
(26963)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«Прамая лінія»

ПЕНСІЙНЫЯ НЮАНСЫ ПЛЮС АДРАСНЫЯ ВЫПЛАТЫ

Пенсіі і адрасная сацыяльная дапамога. Няма сумненняў, што дзве гэтыя тэмы з'яўляюцца актуальнымі для многіх. Таму менавіта ім і будзе прысвечана чарговая «прамая лінія» нашай газеты з удзелам **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ**.

Такім чынам, увага! Наша «прамая лінія» пройдзе **сёння з 12 да 13 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах **(8 017) 292 38 92 і 292 38 21**.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ТАЛЕНТЫ, ЯКІЯ НАРАДЗІЛІСЯ Ў БЕЛАРУСІ, ПАВІННЫ ПРЫНОСІЦЬ КАРЫСЦЬ СВАЙМУ НАРОДУ»

БЕЛАРУСЬ мае патрэбу ў здольных і энергічных людзях. Аб гэтым 30 мая, сустракаючыся з навучэнцамі, студэнтамі і прадстаўнікамі таленавітай моладзі, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, таленавітыя людзі з'яўляюцца лакаматывам сусветнай гісторыі. «Беларуская зямля багата на слаўныя імёны. Іх спадчына — унікальныя помнікі дойлідства, шэдэўры навуковай думкі, літаратуры і мастацтва — з'яўляецца нашай духоўнай апорай і прадметам нацыянальнага гонару, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. — Сёння наша краіна мае патрэбу ў здольных і энергічных людзях. Грандыёзныя планы могуць быць рэалізаваны толькі тымі, хто генерыруе новыя ідэі і ажыццяўляе іх на практыцы. Падтрымка талентаў — інвестыцыі ў будучае».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у кожным дзіцяці закладзены свой талент, і важна своечасова яго ўбачыць і падтрымаць. «Менавіта для гэтага ў Беларусі створана эфектыўная сістэма работы, якая дае магчымасць ва ўсёй паўнаце раскрыць і развіць здольнасці дзяцей і маладых людзей. Любы талент можа разлічваць на адрасную, мэтанакіраваную падтрымку і ўвагу з боку дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што дзясяткі алімпіяд, фестываляў і конкурсаў даюць шырокія магчымасці, каб праявіць сябе. У гэтым годзе да іх дабаўлена яшчэ два тэлевізійныя праекты — «Дзеці новага пакалення» і «Я спяваю!», што адкрылі яркія імёны, якімі краіна па праву можа ганарыцца.

Пры падтрымцы дзяржавы ў краіне расце дастойная навуковая і творчая змена, якая з гонарам прадстаўляе краіну за мяжой. Лепшае сведчанне таго — 26 узнагарод высокай пробы, заваяваных у мінулым годзе беларускімі школьнікамі на міжнародных алімпіядах. Паспяховымі былі і выступленні прадстаўнікоў Беларусі на моладзевых Дэльфійскіх гульнях, Собінаўскім музычным фестывалі, конкурсе «Дзіцячая новая хваля» і іншых прэстыжных творчых спаборніцтвах.

«Краіна дае ўсім вам унікальныя стартавыя магчымасці. Распараджайцеся імі з карысцю як для сябе, так і для сваёй Айчыны. Няхай вашы медалі і прызы прынясуць з часам рэальную карысць Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да ўдзельнікаў мерапрыемства.

«Маладым прадстаўнікам творчых прафесій заўсёды было няпроста прабівацца. У сувязі з гэтым хацеў бы даручыць ураду распрацаваць сістэму садзейнічання маладым талентам ва ўвасабленні іх задум на практыцы і наогул надаць новы імпульс развіццю сучасных напрамкаў мастацтва, дзе моладзь можа рэалізаваць сябе», — сказаў Прэзідэнт.

«Мы ганарымся вашымі поспехамі і ўскладаем на вас асаблівыя надзеі. Але памятайце, што каму шмат дадзена, з таго шмат і спытаюць. У вас усё наперадзе. Будзьце актыўнымі і мэтанакіраванымі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар асобна сказаў цёплыя словы педагогам, намаганні якіх далі магчымасць дасягнуць уражальных вынікаў. Ён таксама прапанаваў звярнуць больш пільную ўвагу на таленавітых педагогаў, якія працуюць у рэгіёнах. «У нас у гімназіях, школах столькі таленавітых выкладчыкаў, што сёння гаварыць аб тым, што ў нас нібыта нейкі дэфіцыт у ВНУ, проста нельга. Вазьміце іх адтуль, вазьміце гэтых настаўнікаў, паплечнікаў, якія рыхтуюць гэтых таленавітых людзей. І я ўпэўнены, што яны фору дадуць усім вашым выкладчыкам, якія сёння працуюць у ВНУ. Трэба прывезці іх з рэгіёнаў і падтрымаць тут».

Аляксандр Лукашэнка па традыцыі ўручыў пераможцам розных міжнародных алімпіяд і конкурсаў пасведчанні, нагрудныя знакі і дыпломы. Ён запрасіў усіх да нефармальнай і адкрытай размовы, прапанаваўшы выказваць цікавыя думкі і прапановы.

«Я вельмі хацеў бы, каб тыя таленты, якія нарадзіліся, узніклі ў нашай краіне, працавалі на нашу краіну. Так, вы можаце ехаць вучыцца куды хочаце, у любы пункт планеты. Вы будзеце запатрабаваны. Але вы павінны памятаць, што карысць вы павінны прыносіць свайму народу», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён адзначыў, што, як правіла, таленавітыя беларусы ў выніку вяртаюцца назад.

«Мы, вядома, нікога трымаць не будзем, але я як Прэзідэнт хацеў бы, каб вы жылі і працавалі тут. Таму што, як ні круці, свая зямля, нашы бацькі, дзяржава ў многім садзейнічалі таму, каб вы не проста нарадзіліся таленавітымі, а змаглі развіць гэты талент. Таму вы проста абавязаны з гэтага пункту гледжання працаваць на нашай зямлі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

БЫВАЙ, ШКОЛА! ВІВАТ, ШКОЛА!

Для 11-класнікаў першай мінскай гімназіі прагучаў развітальны званок. Па традыцыі «званаром» была першакласніца. Выпускнікі дарылі настаўнікам кветкі, выпускалі ў паветра шары з пажаданнямі і танцавалі школьны вальс. Павел Куніцкі, Аляксандр Баброўскі, Артур Белайчук і Ілья Дзянісаў *(на фотаздымку)* **не хавалі сваіх шчырых пачуццяў і эмоцый.**

У ЧЭРВЕНІ ЧАКАЕЦЦА ДА ПЛЮС 34...

У чэрвені Беларусь чакае спякотнае надвор'е, у асобныя дні паветра прагрэецца да плюс 32-34 градусаў. Аб гэтым паведаміў падчас відэабрыфінгу начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў, перадае БЕЛТА.

Уладу над надвор'ем будзе ўтрымліваць антыцыклон з Заходняй Еўропы. Пад яго ўплывам у асобныя дні чэрвеня будуць праходзіць кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці, таксама чакаюцца навальніцы, месцамі град. Тэмпература паветра ў начны час складзе 10-17 градусаў цяпла, у паўночных раёнах краіны пры паступленні свежага паветра будзе плюс 6-9 градусаў. Удзень паветра будзе прагравацца ў асноўным да 18 градусаў цяпла на поўначы краіны і да плюс 25 градусаў у паўднёвых раёнах.

...І ГАРАЧЫНЯ ПАЧНЕЦЦА НА ГЭТЫМ ТЫДНІ

Гарачае надвор'е будзе ў Беларусі на гэтым тыдні, паведаміў падчас відэабрыфінгу начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў, перадае БЕЛТА.

Сёння ўдзень будзе ад плюс 25 градусаў у паўночных раёнах краіны да плюс 30 градусаў у паўднёвых, без ападкаў. У першыя дні лета ў Беларусі таксама будзе стаяць па-сапраўднаму летняе надвор'е. У сераду ўдзень паветра прагрэецца ад плюс 26 градусаў на паўночным усходзе да плюс 32 градусаў на поўдні краіны. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у паўднёвых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ў начны час дасягне 12-18 градусаў.

2 чэрвеня ў другой палове дня месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы, але будзе па-ранейшаму цёпла. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 13-18 градусаў, удзень ад 25 градусаў цяпла ў паўночна-ўсходніх раёнах краіны да плюс 32 па поўдні. У пятніцу ноччу ў паўночна-ўсходніх раёнах месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ў начны час складзе 10-17 градусаў цяпла, удзень паветра прагрэецца ад плюс 20 градусаў па паўночным захадзе да плюс 30 па паўднёвым усходзе краіны. У выхадныя дні чакаецца пераважна цёплае і камфортнае надвор'е, без ападкаў, уначы плюс 6-13 градусаў, удзень 18-25 градусаў цяпла.

Аўтамабільны ажыятаж «вымыў» з валютнага рынку Беларусі амаль $1 млрд

Сярод фактараў, якія прывялі да існуючай на валютным рынку сітуацыі, першы прарэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі доктар тэхнічных навук прафесар Аляксандр Іваноўскі ў эфіры тэлеканала СТБ выдзеліў аўтамабільны ажыятаж і паніку сярод насельніцтва, паведамляе БЕЛТА.

Паводле слоў Аляксандра Іваноўскага, аўтамабільны ажыятаж «вымыў» з валютнага рынку амаль $1 млрд, столькі ж — паніка сярод насельніцтва. «З 1 студзеня краіна знаходзілася пад уздзеяннем адразу па трох напрамках: масіраваным уздзеяннем на грамадства, эканоміку і палітычную сістэму», — сказаў ён. Як адзначыў эксперт, Беларусь засталася фактычна адзінай рэспублікай, у якой не прыватызавана значная колькасць дзяржаўнай уласнасці, такіх «тлустых» кавалкаў у Еўропе больш нідзе не засталося. «Таму націск праводзіцца з мэтай выключыць з нашага абароту гэтыя рэсурсы», — лічыць ён. Закранаючы тэмы даступнасці бензіну, прафесар сказаў, што ажыятаж на беларускіх запраўках пачаўся з таго, што паліва знікла на расійскіх АЗС, якія працуюць у рэспубліцы. «У Беларусі доступ да бензіну ёсць і будзе», — падкрэсліў Аляксандр Іваноўскі.

ПАМЁР ЧЭМПІЁН АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ РАМУАЛЬД КЛІМ

Заслужаны майстар спорту, чэмпіён і прызёр Алімпійскіх гульняў у кіданні молата Рамуальд Клім памёр раніцай 28 мая пасля працяглай хваробы. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.

Рамуальд Клім (лёгкая атлетыка, кіданне молата) нарадзіўся 25 мая 1933 года ў вёсцы Хвоева (Нясвіжскі раён, Мінская вобласць). Заслужаны майстар спорту, чэмпіён гульняў XVIII Алімпіяды ў Токіа (Японія) у 1964 годзе, сярэбраны прызёр гульняў XIX Алімпіяды ў Мехіка (Мексіка) у 1968 годзе, чэмпіён Еўропы ў 1966 годзе, уладальнік Кубка Еўропы ў 1965 і 1967 гадах, чатырохразовы чэмпіён СССР у 1966-1968 гадах, 1971 годзе, двухразовы чэмпіён спартакіяд народаў СССР у 1967 і 1971 гадах, рэкардсмен свету і Еўропы, дзевяціразовы рэкардсмен СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры БССР. Рамуальд Клім таксама быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Цырымонія развітання з заслужаным майстрам спорту, алімпійскім чэмпіёнам Рамуальдам Клімам адбудзецца ў Мінску сёння, 31 мая, з 11.00 да 12.30 у зале прыкладных відаў спорту і адзінаборстваў Спартыўнага камітэта Узброеных Сіл (вул. Герояў 120-й дывізіі, 1).

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

З 1 ЧЭРВЕНЯ СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ — 16 ПРАЦЭНТАЎ ГАДАВЫХ

— Адпаведная пастанова прынятая ўчора, 30 мая, Праўленнем Нацыянальнага банка з улікам росту спажывецкіх цэн і высокіх інфляцыйных чаканняў, якія працягваюцца, — паведаміў нам намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі НБ Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

Стаўка рэфінансавання павышаецца адразу на 2 пункты, і чарговае яе змяненне (адпаведна — і павышэнне працэнтнай стаўкі па дэпазітах) накіравана на павелічэнне даходнасці па ўкладах і ўзмацненне абароны рублёвых зберажэнняў у банках ад інфляцыі. Нацыянальны банк будзе і надалей удзяляць пільную ўвагу захаванасці і прывабнасці рублёвых укладаў насельніцтва і арганізацый у банках.

Кар. «Звязды».

ГАНДЛЁВЫЯ НАДБАЎКІ ЗНІЗІЛІСЯ Ў МІНСКУ НА 43 ГРУПЫ ТАВАРАЎ

Гандлёвыя надбаўкі за выхадныя дні знізіліся ў Мінску на 43 групы тавараў у сярэднім на 5-20 працэнтаў. Аб гэтым паведаміў БЕЛТА намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір Калтовіч.

«28 мая ў сталіцы праведзена маштабная работа з прадпрыемствамі гандлю па зніжэнні гандлёвых надбавак на тавары імпартнай і айчыннай вытворчасці, з найбольш высокім узроўнем росту адпускных цэн пастаўшчыкамі. За два дні гандлёвыя надбаўкі зніжаны на 43 групы тавараў у сярэднім на 5-20 працэнтаў», — сказаў Уладзімір Калтовіч. Так, на крупы ў асартыменце зніжэнне гандлёвых надбавак склала да 10 працэнтаў, селядзец — да 12 працэнтаў, каву, чай, імпартныя фрукты — да 15 працэнтаў.

ВАЎЧЫЦА ЛЕДЗЬ НЕ САРВАЛА АПОШНІ ЗВАНОК

І, напэўна, усё ж зрабіла яго незабыўным для выпускнікоў школы ў вёсцы Сакалоўка Чэрыкаўскага раёна. Яны яшчэ доўгія гады будуць узгадваць выпадак, які пазбавіў іх урачыстай лінейкі на свежым паветры.

Раніцай у панядзелак 30 мая ў вёску забегла ваўчыца, як меркавалася — хворая на шаленства. Таму школьнікаў у клопаце пра іх здароўе і бяспеку эвакуявалі са школьнага двара ў спартыўную залу, дзе і прайшоў паспяхова апошні званок. Між тым сяляне выклікалі з лясной гаспадаркі егераў, якія забілі хворую жывёлу.

Алена КАЗЛОВА.

ГРАД НАРАБІЎ БЯДЫ

У другой палове дня ў нядзелю прайшла навальніца з градам у Ганцавіцкім раёне. Памер градзін дасягаў некалькіх сантыметраў. Ад стыхіі асабліва пацярпелі вёскі Агарэвічы, Кукава, Хатынічы. Град знішчыў пасевы, дзе-нідзе пашкодзіў дамы і гаспадарчыя пабудовы. Паводле інфармацыі Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС, спецыяльная камісія прыступіла да ацэнкі ўрону, нанесенага стыхіяй.

Яна СВЕТАВА.

СТУДЭНТЫ БУДУЦЬ ВАРЫЦЬ ПІВА

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання будзе супрацоўнічаць з кампаніяй Heineken у Беларусі для падрыхтоўкі піваварaў.

Універсітэт у Магілёве — адзіная ВНУ ў краіне, дзе рыхтуюць спецыялістаў у справе вытворчасці піва. Сумесны праект з Heineken дазволіць студэнтам праходзіць практыку на заводах, а кампаніі ў будучыні выгадна прыняць на працу добра адукаваных маладых спецыялістаў. Ва ўніверсітэце спадзяюцца, што студэнты таксама здолеюць рабіць і навукова-даследчыя працы, стваряць новыя рэцэпты піва.

Алена КАЗЛОВА.

НЕ РАЗМІНУЛІСЯ

У нядзелю надвячоркам на трасе Кобрын—Гомель у выніку сутыкнення дзвюх машын загінулі два чалавекі, двое атрымалі траўмы. Недалёка ад вёскі Залессе, што пад Кобрынам, лоб у лоб сутыкнуліся БМВ і «Аўдзі-80». За рулём БМВ быў 25-гадовы хлопец з Драгічынскага раёна. Паводле папярэдняй версіі, ён выехаў на сустрэчную паласу, каб абагнаць машыну, але не разлічыў манеўр і ўрэзаўся ў сустрэчны аўтамабіль. Вадзіцель БМВ і яго пасажыр-равеснік загінулі. Вадзіцель «Аўдзі» і яго пасажыр дастаўленыя ў бальніцу.

БЕЗ СОРАМУ І СУМЛЕННЯ

У Баранавічах асуджаны вандал, які абакраў магілы лётчыкаў Аляксандра Марфіцкага і Аляксандра Жураўлевіча.

Варта нагадаць, што лётчыкі 61-й знішчальнай авіябазы разбіліся на авіяшоу ў польскім горадзе Радаме. Фактычна цаной жыцця яны адвялі палаючы самалёт ад населенага пункта і гледачоў свята.

Яшчэ ў студзені з іх магіл, а таксама іншых пахаванняў на русіноўскіх могілках зніклі дэкаратыўныя элементы помнікаў. Урон быў ацэнены ў 5 мільёнаў рублёў.

Праз некалькі дзён міліцыя выйшла на след выкрадальніка, а потым затрымалі 22-гадовага жыхара горада, які краў на могілках элементы каляровых металаў і нёс у скупку. Злачынцу прызначылі тры гады абмежавання волі, акрамя таго, ён павінен кампенсаваць урон.

Яна СВЕТАВА.

СТАЛА ЦЁПЛА — І...

З надыходам цяпла вада пачынае забіраць ахвяр.

У Кобрынскім раёне ўтапіўся работнік ДЮСШ в. Верхалессе. Мужчына вырашыў пакупацца ў вадаёме. А ў Жабінкаўскім, каля в. Чыжэўшчына, пайшоў на дно меліярацыйнага канала 30-гадовы мясцовы жыхар. 10-гадовая вучаніца з в. Любачын (Лунінецкі раён) надумала перайсці р. Смердзь і ўтапілася.

СХАПІЛІ ЗА РУКУ

Дваіх жыхароў Кобрына міліцыя схапіла за руку на месцы злачынства. Іх затрымалі ноччу каля в. Рагозіна. У аўтамашыне, на якой прыехалі зладзеі, быў знойдзены кабель, пальчаткі ды кусачкі. Як было ўстаноўлена, затрыманыя зразалі кабель з вышак сотавай сувязі. З трох вышак «манцёры» знялі 130 м кабелю. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АД ГУЛЬНІ ДА ШОКУ

Работнікі МНС аказалі дапамогу васьмігадоваму хлопчыку, які разам з сябрам забраўся на дах жылога дома па вуліцы Кабяка ў Гродне.

Архітэктурная адметнасць гэтага будынка ў тым, што ён шматузроўневы. Паглядзеўшы з вышыні птушынага палёту, а дакладней, з даху дванаццатага паверха на горад, дзеці перабраліся на знадворнай лесвіцы на дах дзевятага паверха. Прахожыя ўбачылі іх і забілі трывогу. Адзін з «верхалазаў» спусціўся ўніз, а другі спужаўся, і на зямлю яго даставіў супрацоўнік МНС. Хлопчыка, які быў у шокавым стане, перадалі ў рукі медыкам і, зразумела, на месца здарэння выклікалі маму, паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ЯК ЗДАРОЎЕ, СНД?

У выканаўчым камітэце СНД учора прэзентавалі вынікі міжнароднага праекта HITT-CIS «Здароўе насельніцтва і палітыка ў галіне здароўя ў краінах СНД». Параўнаўчае даследаванне датычылася тэндэнцый у змяненні здароўя насельніцтва, мадэляў ужывання прадуктаў харчавання, алкаголю і тытуню, умоў і ладу жыцця, доступу да аховы здароўя, палітыкі ў галіне аховы здароўя дзевяці краін былога СССР: Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі і Украіны.

Не сакрэт, што ўжыванне тытуню і алкаголю — адзін з самых асноўных фактараў, якія ўплываюць на стан здароўя насельніцтва. У той жа Расіі назіраецца, напрыклад, зніжэнне ўзросту першай спробы курэння і нарастанне інтэнсіўнасці курэння. А ва Украіне алкагольным «напоем №1» стала піва. Яшчэ дзесяць гадоў таму была гарэлка і іншыя моцнаградусныя напоі.

У межах праекта HITT-CIS будзе праведзены параўнальны аналіз падобных звестак, — кажа **дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, прафесар Давід РОТМАН**. — Нам важна ў цэлым выявіць узаемасувязь паміж маштабнымі палітычнымі і эканамічнымі пераўтварэннямі і здароўем насельніцтва, дрэнным здароўем і станам эканомікі ў згаданых краінах. Калі гаварыць больш канкрэтна, то праект HITT-CIS мае на мэце ўнесці ўклад у паляпшэнне стану здароўя насельніцтва і сістэм аховы здароўя краін СНД...

Даследаванне пацвердзіла, што там, дзе людзі неабдумана харчуюцца, не трымаюцца прынцыпаў здаровага ладу жыцця, узровень захваральнасці адназначна вышэй. Выявілася таксама, што надзвычай мала людзей звяртаюцца па меддапамогу, а калі і звяртаюцца, то, як правіла, несвоечасова. Атрыманыя звесткі трэба прааналізаваць і далей можна будзе выкарыстоўваць у якасці рэкамендацый для паляпшэння дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы здароўя.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБАМА ЗБІРАЕ З АМЕРЫКАНЦАЎ ПА 5 ДОЛАРАЎ

Прэзідэнт ЗША Барак Абама заклікаў сугramадзян «скінуцца» па пяць-дзесяць долараў, каб дапамагчы тым, хто пацярпеў ад разбуральнага тарнада ў штаце Місуры.

105 чалавек у Місуры лічацца зніклымі без вестак. Ахвярамі стыхіі з пачатку мая стала 139 жыхароў Джопліна. Праз цэнтр гэтага горада прайшоў ураган, пакінуўшы за сабой лінію разбурэнняў даўжынёй у дзесяць кіламетраў і шырынёй у кіламетр. Прэзідэнт ЗША паабяцаў падтрымку з боку нацыянальнага ўрада і адзначыў, што свой унёсак у справу дапамогі пацярпелым могуць зрабіць усе грамадзяне краіны, «нават калі гэта пяць-дзесяць долараў, колькі можаце». Тарнада, які абрынуўся на горад напярэдадні, ужо прызнаны самым разбуральным у ЗША з 1950 года.

ГЕРМАНІЯ АДМОВІЛАСЯ АД МІРНАГА АТАМА

Наступствы аварыі на АЭС «Фукусіма-1» прымусілі Германію цалкам адмовіцца ад выкарыстання мірнага атама.

Уладу краіны выраШылі спыніць працу ўсіх атамных станцый да 2022 года. Да гэтага тэрміну ўрад разлічвае распрацаваць альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, правесці дадатковыя лініі электрапередач. У сакавіку былі спыненыя рэактары сямі АЭС, пабудаваных да 1980 года. На ўсіх 17 атамных электрастанцыях, якія дзейнічаюць у краіне, пачаліся праверкі на прадмет бяспекі. У выніку працягваюць функцыянаваць толькі чатыры АЭС: «Ізар», «Бракдорф», а таксама па адным рэактару на станцыях «Некарвестхайм» і «Гундрэмінген». Паводле прынятага рашэння спыненыя рэактары ўжо не будуць запушчаныя зноў. Такім чынам, Германія стане першай прамысловай развітой краінай, якая спыніць выкарыстанне атама.

ПАМЁР ПРЭЗІДЭНТ АБХАЗІІ

Абавязкі прэзідэнта часова ўскладзеныя на віцэ-прэзідэнта Аляксандра Анкваба.

У Маскве ў нядзелю, 29 мая, ва ўзросце 62 гадоў памёр прэзідэнт Абхазіі Сяргей Багапш. Прычынай смерці стаў рак. Прэзідэнт Абхазіі Сяргей Васільевіч Багапш нарадзіўся 4 сакавіка 1949 года ў Сухумі. Быў жанаты, у яго засталіся сын, дачка, унук і ўнучка.

РАСІЯНКА АТРУЦІЛАСЯ Ў ТУРЦЫІ

Турыстка з Расіі памерла на турэцкім курорце Бодрум ад атручвання падробленым алкаголем. Загінулая — Марыя Шаляпіна 1983 года нараджэння.

Яшчэ шасцёра грамадзян Расіі знаходзяцца ў вельмі цяжкім стане. Яны дастаўленыя ў бальніцы Анталіі і Дэнізлі і змешчаныя ў рэанімацыйныя аддзяленні. Паводле інфармацыі страхавых кампаній, скаргі на млоснасць, ваніты і страту прытомнасці пачалі паступаць ад турыстаў 28-29 мая. Усім тым, хто звярнуўся па медыцынскую дапамогу, быў пастаўлены дыягназ «атручванне ніякасным алкаголем».

У ГЕРМАНІІ ЎЗАКОНІЛІ ДЗІЦЯЧЫ ШУМ



Дэпутаты нямецкага бундэстага 26 мая аднагалосна ўхвалілі папраўкі да закона аб абароне ад шкодных выкідаў, фактычна ўзаконіўшы дзіцячы шум і пазбавіўшы ўсіх, незадаволеных крыкамі і віскам на дзіцячых пляцоўках, магчымасці падаваць пазовы ў суд.

Раней дзіцячы шум прыраўноўваўся да шуму ад прамысловых аб'ектаў, зараз жа, у адпаведнасці з новымі папраўкамі да закона аб выкідах, дзіцячы шум больш не разглядаецца як «шкоднае ўздзеянне навакольнага асяроддзя». Прадстаўнікі апазіцыі, якія таксама прагаласавалі за закон, патрабавалі пашырыць сферу яго ўжывання і нароўні з гульнявымі пляцоўкамі для маленькіх дзяцей узаконіць шум ад футбольных пляцовак і скейтадромаў, куды прыходзяць старэйшыя дзеці. У лютым 2010 года дзіцячы шум быў узаконены ў Берліне, які стаў першай федэральнай зямлёй, якая заканадаўча замацавала прывілеяваны статус дзіцячага шуму, выразна аддзяліўшы яго ад прамысловых шумоў. Падставай для дзеянняў зямельных і федэральных уладаў па абароне права дзяцей шумець сталі шматлікія судовыя пазовы з боку незадаволеных жыхароў, якіх раздражнялі крыкі дзяцей, што гулялі паблізу. У шэрагу выпадкаў суды ў адказ на скаргі нават зачынялі дзіцячыя садкі.

КМЕН РАТУЕ АД АТЭРАСКЛЕРОЗУ І ЗАПАЛЕННЯЎ

Амерыканскія навукоўцы з Цэнтральнага тэхналагічнага навукова-даследчага інстытута правялі шэраг даследаванняў і высветлілі: кмен дапамагае арганізму змагацца з мікробамі, спраўляцца з высокай тэмпературай, болевымі адчуваннямі і валодае высокай канцэнтрацыяй антыаксідантаў.

Не сакрэт, што свабодныя радыкалы правакуюць акісляльны стрэс. Гэта прыводзіць да парушэння нармальнага цячэння шэрагу працэсаў, развіцця атэрасклерозу, нейрадэгенератыўных хвароб, запаленняў у арганізме, раку і дачаснага старэння. У сваю чаргу антыаксіданты дазваляюць знізіць ступені ўплыву акісляльнага стрэсу. Падчас аналізу эксперты выявілі вялікае ўтрыманне карысных фенольных злучэнняў — антыаксідантаў — у кмене і яго здольнасць цалкам абараніць ад пашкоджанняў ДНК. Таксама ў нетрадыцыйнай медыцыне горкі кмен ужываецца для нармалізацыі працы страўнікава-кішачнага тракту, у якасці адхарквальнага, мачагоннага, гаючага і танізавальнага сродку.

У Мінску супрацоўнікі МНС выратавалі рабочых, якія завіслі на вышыні 6-га паверха

Супрацоўнікі МНС дапамаглі спусціцца на зямлю дваім рабочым, якія завіслі ў будаўнічай люльцы на вышыні 6-га паверха. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў памочнік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Віталь Дзямбоўскі.

Супрацоўнікам сталічнага МНС давялося вызваляць дваіх рабочых, якія знаходзіліся ў будаўнічай люльцы на вышыні 6-га паверха. Рабочыя праводзілі рамонтныя работы будынка па вуліцы Беламорская, 16. Каля 14.00 машыніст пачаў складваць стралу аўтапад'ёмніка, на якой была замацавана люлька з будаўнікамі, каб спусціць рабочых уніз. Але страла пад'ёмніка нечакана перавярнулася, і двое рабочых завіслі ў нахіленай люльцы на вялікай вышыні.

«Да месца здарэння апаратыўна былі накіраваны сталічныя ратавальнікі, якія пры дапамозе аўталесвіцы, страхуючыся вяроўкамі і «кубам жыцця», вызвалілі рабочых. Ужо ў 14.24 моцна напалоханыя, але цэлыя і здаровыя, «верхалазы» былі дастаўлены на зямлю», — удакладніў Віталь Дзямбоўскі.

Утрымацца на вышыні да прыбыцця ратавальнікаў рабочым дапамагла страхоўка, якой яны былі прышпілены да люлькі. У адваротным выпадку ўсё магло б скончыцца трагічна.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.05.2011 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША 4 977,00	1 чэшская крона 290,06	USD 28,0685	
▲ 1 еўра 7 106,66	1 польскі злоты 1 790,22	10 UAH 35,1934	
1 латвійскі лат 10 023,16	▲ 1 расійскі рубель 177,32	10000 BYR 56,8995	
1 літоўскі літ 2 059,80	1 украінская грыўня 624,23	EUR 40,0594	

Аўтарства Уладзіміра Грачкова

Беларусам раяць устрымацца ад спажывання гародніны з Германіі

Успышка кішэчнай інфекцыі ў Германіі, выкліканая так званай энтэрагемарагічнай бактэрыяй Escherichia coli, забрала жыцці ўжо 12 чалавек. Напрыканцы тыдня нямецкія ўрачы паведамлялі пра 600 захворэлых. Большая частка ахворэ кішэчнай інфекцыі пражывае на поўначы краіны. Захворванне працякае ва ўсіх у цяжкай і крайне цяжкай формах. Многія з захворэлых знаходзяцца ў крытычным стане. Некаторыя з іх падключаны да апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх .

Акрамя Германіі, хвароба паспела трапіць у Швецыю, Вялікабрытанію, Данію і Нідэрланды. Усе захварэлыя ў гэтых краінах паведамілі, што нядаўна наведвалі Германію.

Эшэрыхіёз — інфекцыя, даўно знаёмая ўрачам, але зараз медыкі сутыкнуліся, відаць па ўсім, са штамам, які мутіраваў, што значна ўскладняе працэс лячэння. Небяспечная кішэчная бактэрыя дэманструе ўстойлівасць да многіх антыбіётыкаў. Прычым у найбольшай ступені падвержаны гэтай інфекцыі чамусьці прадстаўніцы прыгожага полу.

Усяго вядомыя 42 штамы бактэрыі Escherichia coli. Большасць штамаў бясшкодныя, але некаторыя могуць выклікаць цяжкае працяканне хваробы. Бактэрыя Escherichia coli перадаецца чалавеку галоўным чынам пры спажыванні заражаных харчовых прадуктаў: сырых ці тых, што не прайшлі дастатковую цеплавую апрацоўку, або разам з дрэнна прамытай прадукцыяй раслінаводства. Інкубацыйны перыяд доўжыцца ад трох да васьмі дзён. Асноўныя сімптомы захворвання — крывавая дыярэя, гарачка і ваніты. Разам з тым, інфіцыраванне можа прыводзіць таксама да неўралагічных ускладненняў і хранічных захворванняў нырак. Большасць захварэлых выздараўлівае на працягу дзесяці дзён, але ў некаторых выпадках, асабліва калі ахвярамі інфекцыі становяцца немаўляты і пажылыя людзі, хвароба можа прыняць цяжкую форму з пагрозай для жыцця.

Мяркуецца, што крыніцай распаўсюджвання кішэчнай інфекцыі ў Еўропе сталі іспанскія салатныя агуркі. У Іспаніі зачынены дзве цяпліцы, у якіх магла вырошчвацца заражаная гародніна. Там былі ўзятыя пробы зямлі і вады. У той жа час у самой Іспаніі не было зарэгістравана ніводнага выпадку захворвання. Вядома, што іспанскія салатныя агуркі з той жа партыі былі пастаўлены ў Аўстрыю, Венгрыю і Люксембург, але з гэтых краін пакуль не паступала паведамленняў аб захварэлых вострай кішэчнай інфекцыяй.

Паколькі дакладная крыніца распаўсюджвання кішэчнай інфекцыі не ўстаноўлена, Міністэрства аховы здароўя раіць беларусам устрымлівацца ад спажывання ў ежу гародніны, што паступае з Германіі, а грамадзянам, якія знаходзяцца ў Германіі, — не спажываць гародніну, што не прайшла тэрмічную апрацоўку. У выпадку, калі раней такая гародніна спажывалася і ў чалавека з'явіліся сімптомы кішэчнай інфекцыі, трэба неадкладна звярнуцца па медыцынскую дапамогу, папярэдзіваючы медыкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота БЕЛТА

Сяргей МАРТЫНАЎ:

«ЭКСПАРТ — ГАЛОЎНЫ ЗАНЯТАК КРАІНЫ»

ЛЕПШЫМ экспарцёрам краіны напрыканцы мінулага тыдня ўручылі адмысловыя статуэткі і дыпломы — усяго пераможцы конкурсу «Лепшы экспарцёр года» былі вызначаны ў 16 намінацыях, а яшчэ некалькі прадпрыемстваў узнагароджаны заахвочвальнымі дыпломамі.

— Экспарт для Беларусі — гэта фактычна галоўны занятак краіны. Вы ведаеце, што экспарт з'яўляецца адным з трох нацыянальных прыярытэтаў Беларусі разам з тэмай жылля і харчавання. Беларусь экспартуе значна больш за палову свайго ВУП, ёсць віды прадукцыі, якія практычна на 100% экспартуюцца. Таму экспарцёр — гэта фактычна галоўная прафесія ў нашай краіне ў маім разуменні. І ўручэнне гэтых узнагарод — высокі гонар для тых, хто гэта заслужыў, а таксама прыклад для пераймання, — адзначыў у сваім прывітальным слове **міністр замежных спраў Сяргей МАРТЫНАЎ**.

Пры гэтым ён адзначыў, што менавіта экспарт павінен дапамагчы выбрацца з валютнага крызісу:

— Я мяркую, што ў сённяшняй эканамічнай сітуацыі экспарт — гэта адзін з галоўных напрамкаў выпраўлення такой сітуацыі. І за першыя 4 месяцы гэтага года экспарт развіваецца дастаткова інтэнсіўна, лічбы нарошчвання экспарту дастаткова высокія — 54%. Калі мы возьмем абсалютную суму экспарту за красавік, а гэта, калі я не памыляюся, 3,5 мільярда долараў, то такая сума месячнага экспарту рэкордная для Беларусі за ўвесь існуючы перыяд незалежнасці, вышэй нават, чым да крызісу. Таму трэба сумесныя намаганнямі ўсіх экспарцёраў і дзяржавы працаваць такім чынам, каб мы не зніжалі, а нарошчвалі тэмпы — тады мы зможам дастойна выходзіць з любых сітуацый, — рэзюмаваў Сяргей Мартынаў.

— Тут пытанняў ці сумненняў ні ў каго быць не можа — безумоўна, экспарт сёння важны, як і ўчора, і пазаўчора, і заўтра, — лічыць **Георгій БАДЗЕЙ, старшыня праўлення Бізнэссаюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М.С. Куняўскага**. — Конкурс «Лепшы экспарцёр года» праводзіцца далёка не першы раз, і вельмі добра, што Беларуская гандлёва-прамысловая палата яго арганізавала. Я мяркую, што ён будзе садзейнічаць развіццю экспарту.

Важнасць сваёй дзейнасці ўсведамляюць і самі экспарцёры, што, напрыклад, і пацвердзіў у гутарцы з журналістамі **Анатоль СЦЯЦКО, генеральны дырэктар ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат»**:

— Мы за 4 месяцы маем паказчык 129-130% экспарту, і гэта кажа само за сябе. Па выніках 5 месяцаў працы, я мяркую, гэты паказчык яшчэ вырасце — мы робім максімум намаганняў, каб не збаўляць тэмпы: краіне патрэбна валюта, і мы яе зарабляем, — сказаў Анатоль Сцяцко, але адзначыў, што экспарцёрам больш спакойна працаваць пры стабільным курсе рубля: — За ростам курса валюты расце і ўсё астатняе — мы купляем закваску, упакоўку, абсталяванне... І гэта ўсё расце разам з курсам долара. Таму нам лепей працавалася, калі была стабільная валюта.

А вось **дырэктар ААТ «Бабулін гладыш» Ігар КАНАНЧУК**, наадварот, лічыць сённяшнюю сітуацыю для экспарцёраў вельмі спрыяльнай:

— Для экспартаарыентаваных прадпрыемстваў гэта толькі сыграла ў станоўчы бок. Бо ў нас асноўная маса разлікаў за беларускія рублі: у структуры сабекошту сыравіна займае 70-75%, а энерганосьбіты і іншае — каля 4%. Таму сёння для экспартаарыентаваных прадпрыемстваў такая сітуацыя спрыяльная — завозіць валюту, якая карыстаецца вялізнай папулярнасцю, яе рэалізоўваць і далей накіроўваць сродкі на разлікі і на развіццё прадпрыемства. Так, ёсць 30-працэнтны абавязковы продаж валютнай выручкі, але і курс банка сёння таксама нядрэнны, будзем так казаць. А ўжо 70% прадаём потым у залежнасці ад попыту. А попыт на валюту проста вялізны.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Лепшыя экспарцёры краіны па выніках 2010 года:

Намінацыя	Пераможца
Вытворчасць бытавых тавараў для насельніцтва	**Брэстгазаапарат**
Дрэваапрацоўчая, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць	**Светлагорскі ЦКК**
Прадпрыемствы і арганізацыі, занятыя ў галіне інфармацыйных тэхналогій	**ЭПАМ Сістэмз**
Лёгкая прамысловасць	**«Контэ Спа»**
Лясная гаспадарка і лесанарыхтоўчая прамысловасць	**Асіповіцкі доследны лясгас**
Прадпрыемствы малога прадпрымальніцтва	**АВІ**
Машынабудаўніцтва і металаапрацоўка	**Беларускі аўтамабільны завод**
Металургія	**Беларускі металургічны завод**
Харчовая прамысловасць	**«Бабулін гладыш»**
Сельская гаспадарка	**Агракамбінат «Скідзельскі»**
Будаўніцтва і вытворчасць будматэрыялаў	**Бярозабудматэрыялы**
Фармацэўтычная і мікрабіялагічная прамысловасць	**Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў**
Нафтаперапрацоўчая, хімічная і нафтахімічная прамысловасць (арганізацыі з гадавым аб'ёмам экспарту да 25 млн долараў)	**Завод горнага воску**
Нафтаперапрацоўчая хімічная і нафтахімічная прамысловасць (арганізацыі з гадавым аб'ёмам экспарту больш за 25 млн долараў)	**«Гродна Азот»**
Электроніка і прыборабудаванне	**«Інтэграл»**
Электратэхнічная і оптыка-механічная прамысловасць	**Мінскі электратэхнічны завод імя Казлова**

МЗС: ЗАЯВА АБАМЫ ПА БЕЛАРУСІ НЕПРАВАМЕРНАЯ І НЕ ЗАСНАВАНА НА РЭАЛЬНЫХ ФАКТАХ

Заява прэзідэнта ЗША Барака Абамы па Беларусі з'яўляецца неправамернай і не заснавана на рэальных фактах. Аб гэтым БЕЛТА заявіў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных, каментуючы названую заяву.

«Чарговы раз амерыканскі бок заяўляе аб узмацненні санкцый — пры тым, што ЗША з уласнага вопыту адносін з шэрагам краін павінны цудоўна ведаць, што палітыка санкцый не дзейнічае, — адзначае Андрэй Савіных. — Як можна задумваць увядзенне санкцый супраць дзяржаўных прадпрыемстваў, на іх жа працуе значная частка насельніцтва Беларусі, яны ў значнай ступені фарміруюць бюджэт краіны, гэта значыць ахову здароўя, сацыяльнае забеспячэнне, пенсіі, адукацыю. Тады супраць каго на справе накіраваны гэтыя санкцыі?»

На думку прэс-сакратара, гэта простае супастаўленне паказвае крывадушнасць сцвярджэнняў аб «падтрымцы беларускага народа». Андрэй Савіных дадаў: «Мы перакананы ў важнасці ўзаемадзеяння Беларусі з ЗША. Злучаныя Штаты павінны знайсці ў сабе сілы адмовіцца ад ілжывых стэрэатыпаў і ўстарэлых падыходаў». Як адзначае прадстаўнік МЗС Беларусі, ужо даўно пара пачаць выбудоўваць канструктыўнае супрацоўніцтва ў сапраўдных інтарэсах абодвух народаў. «Мы заўсёды былі да гэтага гатовы — і гатовы цяпер», — рэзюмаваў ён.

Абзац

◢ Вуліцы імя Міхала Агінскага, Францішка Багушэвіча, Уладзіміра Караткевіча і Напалеона Орды з'явяцца ў новым жылым раёне Гродна «Альшанка». Такое рашэнне прыняў гарадскі савет дэпутатаў. Пры гэтым ён кіраваўся прапановамі тапанімічнай камісіі. Сваю назву новы раён, які месціцца побач з мікрараёнам «Паўднёвы», атрымаў з улікам гістарычных тапанімічных назваў гэтай мясцовасці — Малая Альшанка і Вялікая Альшанка.

◢ **Аўтазаправачныя станцыі сістэмы канцэрна «Белнафтахім», якія знаходзяцца ў прыгранічнай зоне і паблізу асноўных аўтамагістраляў Беларусі, пачалі рэалізацыю аўтамабільнага паліва іншаземным асобам за валюту. Канцэрн скарыстаўся дазволам Нацыянальнага банка Беларусі пашырыць выкарыстанне валюты ў разліках фізічных асоб на тэрыторыі рэспублікі.**

◢ Генеральны дырэктар мінскай будаўнічай фірмы ЗАТ «Трэст БелПСП-буд» і шэраг пасадавых асоб абвінавачваюцца ў вымагальніцтве хабару. Са студзеня па май гг. ён і саўдзельнікі вымагалі для сябе хабар у дырэктара іншай будаўнічай арганізацыі. Свае паслугі яны ацанілі ў памеры 6,5 % ад сумы дамовы на пастаўку будматэрыялаў — на той час гэта складала Br73 млн. На думку міліцыі, за гэтыя грошы гендырэктар абавязаўся забяспечыць перамогу у таргах па выбары пастаўшчыка дахавага матэрыялу для рэканструкцыі Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе. Ён паспеў атрымаць першую частку хабару ў памеры больш за $10,6 тыс.

Поўны абзац

◢ **Стары бразілец застаўся жыць дзякуючы зубному пратэзу. 81-гадовы Закарыяс Пачэку дэ Мараіс не загінуў таму, што куля, выпушчаная яму ў твар, адскочыла ад яго ўстаўной сківіцы. На Закарыяса напалі ў яго ўласным бары ў горадзе Алта Фларэста. Па словах урачоў, куля магла трапіць у мозг мужчыны, аднак, стукнуўшыся ва ўстаўную сківіцу, змяніла траекторыю і захрасла ў горле. Пацярпелага шпіталізавалі, зараз яго стан ацэньваецца як стабільны.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ПА ДЗІЦЯЧЫХ ПРАВІЛАХ

Карэктывы ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і мацуюць малых у правах

УСЁ самае лепшае — дзецям. Тэзіс, які мы не ставім пад сумненне. Не разважаем, пра выхаваўчы эфект. Не ацэньваем плюсы і мінусы. Мы проста так жывём. З малаком маці, відаць, перадаецца... Мой знаёмы, выхаваны ў каўказскіх традыцыях, з іх шанаванне старэйшых, кажа: галоўная праблема беларускай сям'і ў тым, што дзеці тут на асаблівых правах. Можна доўга разважаць, добра гэта ці дрэнна, але ж яно менавіта так. Дзеці для нас — святое. І трапяткое стаўленне да іх не толькі ў бацькоў, якія гатовы самі хадзіць у лахманах, абы дзецям аддаць усё самае лепшае. Малога ўсім аўтобусам «абаранялі» ад кандуктара, калі праезд для школьнікаў быў платны. Ды што там, малога абараняюць усёй дзяржавай. Сістэма дапамог, гарантый, ільгот выбудоўвалася гадамі. І любыя змены ў ёй робяцца зноўтакі з аглядкай на дзяцей. Новыя папраўкі ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і, напрыклад.

— Там вельмі шмат новаўвядзенняў пазітыўнага плану менавіта па абароне дзяцей, — аналізуе распрацаваныя карэктывы **Ніна ФЕДАРУК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.**

Разам з калегамі яна падтрымала законапраект у першым чытанні. Дэпутаты, дарэчы, кодэксам дужа зацікавіліся: выказалі шмат прапаноў. А як жа, тэма закранае ўсіх. Дзяцей жа новая версія кодэкса яшчэ больш мацуе ў правах. Напрыклад, у дзесяцігодкі цяпер стануць пытацца, з кім і дзе ён хоча жыць у выпадку разводу бацькоў, як часта бачыцца з бабулямі і дзядулямі або каго абярэ сабе ў апекуны.

— Вельмі слушнае новаўвядзенне, мяркую. Дзіцянё — гэта асоба, яго меркаванне варта ўлічваць, — дзеліцца сваімі развагамі суразмоўніца.

Дзяцей умацуюць і матэрыяльна.

— Аліменты вызначаюцца ў фіксаваным памеры — выходзячы з сярэдняга заробку — незалежна ад таго, у сталіцы ці глыбінцы пражывае той, хто іх выплачвае, і колькі ён зарабляе, — расказвае дэпутат. — А на дзяцей-інвалідаў аліменты трэба будзе плаціць і пасля 18 гадоў. На жаль, гэта не рэдкасць, калі мужчыны сыходзяць з сям'і, дзе выхоўваецца хворае дзіця. А выдаткі на яго большыя, і адзінокай маці забяспечыць яго вельмі складана.

Індывідуальныя рэчы дзіцяці не стануць прадметам дзяльбы ў сварках былых сужэнцаў. Яго адзенне, абутак, музычныя інструменты, школьныя прылады ды ўсё, што яму належыць, па законе застанецца ў таго з бацькоў, з кім малы будзе жыць.

Мужа і жонку, якія скасоўваюць шлюб, закон абавязвае заключыць пагадненне аб дзецях: з кім будуць жыць, памер аліментаў і гэтак далей. Заўжды лепш вырашаць супярэчнасці дагаворным, а не судовым шляхам.

Дадатковую падстрахоўку дзіцяці забяспечваюць заканадаўцы не толькі на выпадак разводу, але і пры ўсынаўленні. Памятаючы гісторыю пра Віку Мароз (якую італьянская сям'я так хацела ўдачарыць, што не пажадала вяртаць на радзіму пасля летніх канікулаў), заканадаўцы прапісалі чорным па белым: прыярытэт на ўсынаўленне — у беларусаў. Патрабаванні да патэнцыйных прыёмных бацькоў увогуле павышаюцца. Нават узроставы цэнз уводзіцца.

— Максімальная разбежка ва ўзросце паміж усынавіцелем і прыёмным дзіцем — 45 гадоў. Робіцца з тым разлікам, каб выгадаваць змог, — тлумачыць дэпутат. — Усынавіцель абавязкова павінен быць старэйшым за прыёмнае дзіця як мінімум на 16 гадоў. Таксама па зразумелых прычынах, каб гэта былі адносіны бацькоў і дзяцей. Занадта малая розніца ва ўзросце, як і празмерна вялікая, прыводзіць да дысбалансу ва ўзаемаадносінах, што выклікае складанасці ў выхаванні.

Паўнавартаснае выхаванне можа быць толькі ў сям'і, пераканана народная выбранніца. Такога падыходу прытрымліваецца і дзяржаўная сацыяльная сістэма.

— Якімі б ідэальнымі ні былі ўмовы ў сацыяльных установах, інтэрнаты ніколі не заменяць сям'ю. У нас цяпер наогул такая тэндэнцыя, што скарачаецца колькасць інтэрнатаў. Усё больш сірот выхоўваецца ў прыёмных сем'ях, дзіцячых дамах сямейнага тыпу. Актыўна практыкуецца патранатнае выхаванне. Для дзіцяці за радасць адчуць, што такое бацькоўская ласка, хоць бы на выхадных ці ў канікулы. Апроч пазітыўных эмоцый, гэта яшчэ і важны выхаваўчы момант: у падлетка фарміруецца мадэль сям'і. Дзеці, якія выхоўваюцца ў інтэрнатах, растуць на ўсім гатовым. Яны не прыстасаваны да рашэння побытавых, міжасабовых праблем. Трапіўшы на выхадныя ці канікулы ў прыёмныя сем'і, дзеці-сіроты атрымліваюць навыкі сямейнага жыцця, працоўнай дзейнасці, уяўленне пра элементарныя побытавыя клопаты. Гэта дае ім магчымасць убачыць сапраўдную сям'ю, зразумець, як там складваюцца ўзаемаадносіны. А сённяшнія малыя — гэта будучыя бацькі, таму для дзяржавы вельмі важна, у якіх умовах яны растуць. Выхаванне будучых мамы і таты пачынаецца менавіта ў сям'і: дзеці капіруюць паводзіны бацькоў, і гэтыя дзеці павінны выхоўвацца ў сям'і, а не ў сацыяльнай установе.

За патранатнымі выхавальнікамі нагляд таксама ўзмацняецца. Вядуць яго адразу з двух бакоў: органы апекі па месцы жыхарства выхавальніка і тая ўстанова, якая скіравала дзіця ў сям'ю.

— Кантроль за дзецьмі-сіротамі, я вас упэўніваю, дзейсны, — сцвярджае парламентарый. — Ацэньваюць умовы пражывання, харчавання ў прыёмных, апякунскіх сем'ях. Прычым заўжды цікавяцца меркаваннем самога дзіцяці: як яму ў гэтай сям'і жывецца. Маленькі чалавек сам сябе абараніць не можа. Калі ён сірата, яго павінна абараніць дзяржава. Непасрэдная адказнасць кладзецца на органы апекі і папячыцельства, камісіі па справах непаўналетніх.

Многія з тых, хто вырас без бацькоў, стаўшы дарослымі, хочуць даведацца, хто даў ім жыццё. Раней гэта была літаральна таямніца за сямю пячацямі. Цяпер заканадаўцы вырашылі даць ім такое права. Дасягнуўшы паўналецця, сіроты змогуць даведацца, хто іх бацькі, — у судзе, органах апекі ці ЗАГСе.

— Законапраект вельмі пазітыўны: ён у многім паляпшае абарону дзяцей — і ў сям'і, і пры скасаванні шлюбу, і ў інтэрнаце. Усе прапанаваныя новаўвядзенні на карысць дзіцяці, — рэзюмуе Ніна Федарук.

Паводле яе ўражанняў, дзяржавай робіцца ўсё, каб былі моцныя сем'і і не было сацыяльных сірот.

РАЗЛІК ПА ШЛЮБЕ

Мне вядомыя пары, якія ладзяць рэгістрацыю і святкаванне шлюбу ў розныя дні толькі з-за таго, што не могуць «распісацца» на прыродзе. Адны банальна не хочуць праводзіць трапяткую цырымонію ў сценах ЗАГСа, дзе, скажам прама, даведацца таўчыся ў чарзе з іншымі ахвотнікамі звязацца «ланцугамі Гіменея» і адчуваць сябе на канвееры па вытворчасці ячэек грамадства. Другія ніяк не могуць увязаць у шчыльным вясельным графіку паездку ў ЗАГС і загарадны паркатэль. Так, многія схітраюцца і робяць тэатралізаваны роспіс. Але ж гэта ўжо не тое. Не ведаю, як у вас, а ў мяне ёсць улюбёная вясельная традыцыя — расчуліцца да слёз пад марш Мендэльсона. Ну і як, скажыце, гэта рабіць, калі я ведаю, што пасведчанне аб шлюбе ў іх ужо пыліцца на паліцы?!

Дзякуючы новаму законапраекту праблема вырашыцца. Рэгістрацыю шлюбу, як распавяла дэпутат Ніна Федарук, можна будзе здзейсніць у любым упадабаным месцы. «Незалежна ад прапіскі», — робіць важнае ўдакладненне парламентарый.

Зменіцца і яшчэ сёе-тое ў цырымоніі. Напрыклад, традыцыйнае пытанне пра тое, хто чыё прозвішча пакіне сабе пасля шлюбу, гучаць ужо не будзе. Свае пажаданні маладыя выкажуць яшчэ пры падачы заявы. Добрая ідэя, на мой погляд. А тое розныя казусы здараюцца. Вунь у маёй знаёмай прозвішча пры жаніцьбе змяніў... муж. Сваё ў яго занадта немілагучнае было, я б нават сказала лаянкавае. Вось ён і скарыстаўся магчымасцю. Але ж многіх свякоў у шаноўным узросце тым самым прывёў у шок. Недарэчнасці ўдалося б мінуць, прыбяры заканадаўцы гэта пытанне з цырымоніі раней...

Дарэчы, чакаць цырымоніі таксама давядзецца менш. Цяпер нельга афарміць адносіны раней, чым праз 15 дзён пасля падачы заявы. І тое калі форс-мажор (цяжарнасць, напрыклад), а так дык нагул два месяцы таміцца давядзецца. З увядзеннем закона ў дзеянне, чаканне скароціцца да трох дзён. А ў выключных абставінах шлюб афармяць і ў дзень падачы заявы. Чаму не? Касі, каса, пакуль раса!

— Я лічу, гэта абсалютна мэтазгодна, — заўважае Ніна Федарук. — Падаючы заяву, маладыя людзі дакладна ўжо ўсё абдумалі. Нашто ім яшчэ час? Тым больш што розныя сітуацыі ў жыцці бываюць: можа, тэрмінова ад'язджаць трэба, ды ці мала што. Неабходна, каб была ў людзей свабода манеўру.

Меркаванне пра тое, што змяншэнне часу на роздум не павялічыць колькасці скараспелых разводаў падзяляе і **міністр юстыцыі Віктар ГАЛАВАНАЎ**. Ён агучыў яго, адказваючы на пытанні дэпутатаў у Авальнай зале. Наадварот, міністр углядае ў новаўвядзенні пазітыў. Азначаную норму ён назваў антыкарупцыйнай. Раней жа як атрымлівалася: расспасуца нельга, але вельмі трэба, вось нецярпліўцы і давалі хабар супрацоўніку ЗАГСа. Цяпер падстаў для хабарніцтва павінна стаць менш.

Усё больш звыклым элементам вясельнага перапалоху становіцца не толькі выбар фатографа і карчмы, але і заключэнне шлюбнай дамовы. Цяперашнім парам не займаць даследчанасці, адукаванасці і прагрэсіўнасці. Шлюбны кантракт яны ўспрымаюць як звычайны атрыбут новага жыцця, а не штосьці экстраардынарнае. Каля трох тысяч пар у нас летась заключылі такое пагадненне. І як зазначыў міністр, гэтая «практыка атрымлівае з кожным годам усё большае распаўсюджванне».

— Мне падаецца, гэта важны дакумент, які проста страхуе два бакі, — дзеліцца сваім меркаваннем маладажон Віталь. — Не трэба яго баяцца і ставіцца па прынцыпе «Ты мне не давяраеш?».

А паралель і сапраўды слушная. Тое самае, калі на курорт збіраемся. Мы ж не настройваемся на тое, што выб'ем зуб у аквапарку ці паранімся аб марскога вожыка, але ж страхоўку афармляем. Так і з шлюбам. Настройся на лепшае, але падмацуйся на выпадак найгоршага!

Дагавор заключаецца натарыяльна. Там агаворваюцца ўмовы ўтрымання абодвух сужэнцаў, маёмасныя правы — тое, з чым на практыцы ўзнікае больш за ўсё праблем. Карацей, горш ад зробленай загадзя дамовы не будзе. Тым больш што статыстыка не дае асаблівых нагод для аптымізму: дынаміка разводаў у Беларусі не зніжаецца. Самыя непастаянныя ў сямейным жыцці — гэта мінчане. «У асобныя гады ў нас скасаванне шлюбу дасягае да 50 адсоткаў ад ліку заключаных», падзяліўся з парламентарыямі міністр юстыцыі.

З прагрэсіўнасцю да сучаснай моладзі прыходзіць і адмаўленне каштоўнасці штампа ў пашпарце. А што, жыць разам цяпер можна і без дазваляльнай паперы. Таму і так званых грамадзянскіх шлюбаў зараз як апалага лісця ўвосень. «Яшчэ пяць — сем гадоў таму гэта асуджалася, — згадвае міністр. — Цяпер шырока распаўсюдзілася. Значная колькасць людзей жыве ў грамадзянскім шлюбе, які не параджае ніякіх юрыдычных наступстваў».

Цікава, як ставяцца да гэтага заканадаўцы, чым могуць «спакусіць» заўзятых непрымальнікаў шлюбу?

— Чалавек мае права на свабоду выбару, — так па-філасофску ставіцца да свабодных нораваў сучаснай моладзі дэпутат, якая ўжо гадуе ўнукаў. — Але ж кожны чалавек жыве ў грамадстве, а яно існуе ў рамках прававога поля. І калі датычыць нейкіх момантаў, без заканадаўчага афармлення не абысціся. А ўвогуле, я лічу, добрая традыцыя замацоўваць шлюб у царкве. Гэта асаблівы крок. Шлюб, заключаны ў царкве, — святыня. Гэта таксама мацуе сям'ю: каб была надзейнай, каб не было разводаў, каб выхоўвалі дзяцей правільна. Місія сям'і, я ўпэўнена, — выхаванне дзяцей. Шчаслівай, паўнавартаснай сям'і не можа быць, калі няма дзяцей. Вялікае дабро — мець дзяцей, а кожнае дзіця хоча маму і тату.

Ала МАЧАЛАВА.

МЕТАЛАШУКАЛЬНІКІ НЕ СПЯЦЬ

У Мазыры невядомы злодзей пракраўся на будоўлю спартыўна-аздараўленчага цэнтра. Там ён залез на вежавы кран, з якога выкраў 16,5 м сілавога кабеля, чым прычыніў шкоду мясцоваму будаўнічаму прадпрыемству больш чым на 800 тысяч рублёў. Між тым, тэрыторыя знаходзіцца пад аховай, як і ў выпадку крадзяжу 22 секцый радыятарных батарэй з будоўлі ў Гомелі. А вось жыхар Хойнікаў на працягу мінулага года з дапамогай зваркі зразаў з басейна, які не працаваў, металічныя канструкцыі. Іх знайшлі на тэрыторыі яго домаўладання. Страты ацэнены ў 4 млн рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

БОЛЬШ ЗА ТЫСЯЧУ ЎЗРЫВАЛЬНІКАЎ НА ПОЛІ

Ля вёскі Бароўка Лепельскага раёна на полі знайшлі больш за 1040 узрывальнікаў і тры снарады часоў Вялікай Айчыннай вайны.

А ля вёскі Цетча Ушацкага раёна, таксама на полі, аказвалася, знаходзіўся цэлы арсенал: 161 артылерыйскі снарад і 16 узрывальнікаў. Сапёры, як заўсёды, аператыўна прыбылі на месца. Небяспечныя знаходкі абязшкоджаны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДА РЫБЫ І КАМБІКОРМ ПРЫХАПІЛІ

Супрацоўнікі бярозаўскай міжрайінспекцыі затрымалі станочніка і цесляра, якія кралі рыбу ў рыбгаса «Сялец». Падчас следства было ўстаноўлена, што яны ўкралі не толькі 69 кг рыбы, а яшчэ і 590 кг грануляванага камбікорму. Рыбу і камбікорм вярнулі рыбгасу, а на злодзеяў сабраны матэрыял для завядзення крымінальнай справы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КПУП «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» ФИЛИАЛ «ЭКСПЕРТ-УСЛУГА» (организатор аукциона)
информирует о снятии с аукциона, проводимого 22 июня 2011 года, лота № 1 **– МАЗ-54329-20ЕА1007 – 1994 г. и Полуприцеп ОДАЗ 9950 – 1990 г.,** начальная цена продажи с учетом НДС – **23 760 000 белорусских рублей, задаток – 2 000 000 бел. руб., с учетом НДС.** Извещение о проведении аукциона вышло 19.05.2011. в газете «Звязда».
Тел. в Гомеле 74 17 34.

ПІСТАЛЕТ ПАД РУКОЙ

З Баранавіцкага камбіната харчовых прадуктаў выязджаў аўтамабіль «ЗІЛ-441510». Калі ахоўнік праверыў яго, то ў аўтамашыне ўбачыў пісталет «Браўнінг». Кіроўца растлумачыў, што знайшоў яго падчас зносу дома ў в. Галевічы. Праводзіцца праверка.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«ПІСЬМЯНКОЎ ЛУГ» — СВЯТА ПАЭЗІІ

У Касцюковіцкім раёне прайшло рэгіянальнае свята паэзіі і аўтарскай песні, якое названа ў гонар вядомага беларускага паэта і мясцовага ўраджэнца Алеся Пісьмянкова.

Імпрэза, у якой бралі ўдзел больш за паўтысячы чалавек, праходзіла на радзіме паэта, паблізу вёскі Бялынкавічы, на маляўнічым беразе ракі Бесядзь. На конкурсе маладых паэтаў чыталі свае вершы паэты з Касцюковіцкага раёна, а таксама з Гомеля, Быхава, Чэрыкава, Клімавічаў, Слаўгарада і нават Санкт-Пецярбурга. Пераможцай стала Святлана Маісеенка з Касцюковічаў. У конкурсе аўтарскай песні лепшымі прызнаны Міхаіл Судзін з Крычава і Віталь Анжанкоў з Касцюковічаў.

Госці свята «Пісьмянкоў луг» атрымалі асалоду ад канцэрта і вечарыны паэзіі, набылі сувеніры ў народных майстроў, а таксама пачаставаліся шашлыкамі, марозівам і напоямі.

Ілона ІВАНОВА.

КОНВЕРТИРУЙТЕ БЕЛОРУССКИЕ РУБЛИ В НЕДВИЖИМОСТЬ!
ПРОДАЮТСЯ ПОМЕЩЕНИЯ ПРОИЗВОДСТВЕННО-СКЛАДСКИЕ
РАЗМЕЩЕН ВАРИАНТ СОВМЕСТНОГО ИСПОЛЬЗОВАНИЯ
г.Новогрудок ул. Гродненская, 52
Общ. площадь 4 520,8 кв.м.
Огороженная и частично заасфальтированная территория; водопровод, канализация, тепловая и электрическая сети; телефонные линии.
Состояние помещений хорошее.
Осуществлен ремонт крыш.
Установлены двухкамерные стеклопакеты.
Земельный участок 2,3015 га
Помещения:
- производственные помещения общ. пл. 2630,9 кв.м.
- административно-хозяйственное здание пл. 168,3 кв.м.
- 2 проходные общ. пл. 157,9 кв.м.
- гараж, столярная мастерская пл. 194,6 кв.м.
- складские помещения пл. 1325,2 кв.м., высота потолка 7,5 м (новая кровля ПВХ-мембрана)
- трансформаторная подстанция пл. 43,9 кв.м., 650 кВт
ООО "Олимп" Т. (017) 387-01-01

Беларусы збіраюцца паўтарыць «маленькі цуд» з Францыяй

І калі не перайграць, то хаця б «крышачку напалохаць»

3-га чэрвеня наша нацыянальная зборная згуляе хатні матч з самым моцным супернікам групы ў межах адбору да чэмпіянату Еўропы-2012 — камандай Францыі. Абідаль, Насры, Анэлька, Рыберы — зборная зорак і адначасова вялікая ганьба чэмпіянату свету-2010. Няшчасцем «трохколерных» пасля няўдач у Паўднёвай Афрыцы мы ўжо скарысталіся — у Парыжы на «Стад дэ Франс» іх перайгралі. Нагадаем, што адзіны мяч у той сустрэчы забіў Сяргей Кісляк. Што цяпер? Матч-рэванш.

Падапечныя Ларана Блана рыхтуюцца да паездкі грунтоўна — каб ніхто не перашкаджаў, каманда цалкам выкупляе пяцізоркавы гатэль «Еўропа». Тэлежурналісты, якія будуць весці прамую трансляцыю (160 чалавек), прыбываюць у Мінск. Ну і нарэшце, французы паскардзіліся УЕФА на якасць нашага газона. Так што ўсё вельмі сур'ёзна. Згодны з гэтым і Бернд Штанге:

— Несумненна, у французаў будзе рэваншысцкі настрой. Вы ведаеце нашы праблемы, ведаюць іх і яны. Але мы пастараемся нашых гульцоў пазбавіць ад страху.

А ўвогуле аптыміст Штанге разлічвае стварыць «невялікі цуд»:

— У футболе магчымыя цуды. І мы пастараемся падрыхтаваць каманду, якая яго здзейсніць. Францыя ў індывідуальным класе мацнейшая за нас. Яна ўзмацнілася за кошт Эўра, Рыберы, Абідаля, Насры, якія ў верасні не гулялі. Яны гуляюць на ўзроўні сусветных стандартаў. Нам патрэбна штосьці іншае: маральная моц і барацьба.

У беларусаў траўмаваны ці дыскваліфікаваны шэраг асноўных гульцоў — Аляксандр Глеб, Сяргей Карніленка, Віталь Радзівонаў, Віталь Кутузаў, Аляксандр Юрэвіч. І, нягледзячы на веру ў цуды, галоўны трэнер рэальна ацэньвае расстаноўку сіл:

— Іспанія, Англія, Германія, Італія, Францыя — усе моцныя каманды зоймуць першыя месцы ў сваіх групах. А такія каманды, як Беларусь, Малдова, Латвія — для таго, каб іх разлаваць. Рыберы каштуе 40 мільёнаў, але, магчыма, яму не знойдзецца месца ў стартавым складзе. У нас іншы ўзровень. Але мы таксама хочам іх крышачку напалохаць.

А наконт газона гер Штанге не згодны з супернікам:

— Я ведаю, што шмат зроблена, каб палепшыць якасць поля, што яно будзе у прымальным стане. Не ідэальнае, безумоўна, як більярдны стол, але прымальнае.

У трэнера не маглі не спытаць, ці

На праспекце «Звязды»

ЗОРКІ ДЛЯ ДЗЯЎЧЫНЫ І ПАДЗЯКА НАСТАЎНІКУ

На праспекце «Звязды» ў Мінску знаходзіцца ліцэй №1, вучні якога становяцца лепшымі з лепшых

Так, напрыклад, адзін з ліцэістаў зрабіў тэлескоп, які ўразіў журы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. А дэкан факультэта радыёфізікі БДУ са здзіўленнем убачыў, што траціна пераможцаў алімпіяды сярод школьнікаў, якую правёў факультэт, — вучні менавіта гэтай установы.

Перамога 24-х

Доктар тэхнічных навук, прафесар Сцяпан МУЛЯРЧЫК у гэтым выпадку проста не мог не прыехаць сюды, каб уласнаручна ўручыць дыпломы пераможцаў ліцэістам, паглядзець на гэтых таленавітых маладых людзей і асабіста запрасіць іх на свой факультэт.

— Узровень адукацыі на факультэце можна назваць вышэйшым пілатажам, але для таго, каб нашы праграмы былі ўспрынятыя, трэба, каб да нас прыйшлі вельмі здольныя, таленавітыя дзеці. Па выніках алімпіяды я ўбачыў, што такія дзеці навучаюцца тут. Таму яны мне патрэбныя, — патлумачыў дэкан журналісту «Звязды» сваю ініцыятыву і дадаў: — Я шкадую толькі пра адно — што дагэтуль не супрацоўнічалі з гэтай навучальнай установай. Але мы гэта паправім. Мы намераны заключаць доўгатэрміновую дамову аб супрацоўніцтве з ліцэем, тым больш што ён знаходзіцца ад нас недалёка.

Прафесар Мулярчык расказаў, што алімпіядны рух на факультэце радыёфізікі існуе больш за 25 гадоў. У першыя гады алімпіяда была асноўным метадам адбору дзяцей, якія добра падрыхтаваныя ў вобласці фізікі. У некаторыя гады па пэўных спецыяльнасцях да 90 працэнтаў набору факультэт закрываў за кошт дыпламантаў такіх алімпіяд. У адрозненне ад рэспубліканскай, гарадскіх і раённых алімпіяд, універсітэцкая мае іншыя мэты. Калі ў першым выпадку важна вызначыць пераможцу і «дзясятку» лепшых, то мэта апошняй — вызначыць усіх тых, хто варты стаць студэнтам факультэта. Таму пераможцаў, як правіла, шмат, часам іх колькасць даходзіць да 100 чалавек. Сёння яны ўжо не маюць тых прывілей, што раней, але атрымліваюць пераважнае права на залічэнне ў выпадку паўпрахаднога бала.

— Сёлетняя алімпіяда, калі праводзіць аналогію з фігурным катаннем, адносілася да катэгорыі «абавязковай праграмы», — казаў Сцяпан Рыгоравіч на сустрэчы з ліцэістамі. — Гэта былі задачы сярэдняй складанасці, якія дазвалялі вызначыць узровень падрыхтоўкі па фізіцы. Шэсць задач трэба было рашыць за 2 гадзіны. У адрозненне ад ЦТ, мы правяралі кожную задачу, па кожнай глядзелі, як чалавек думаў, што ён зрабіў і на якім этапе спыніўся. Кожная задача ацэньвалася па 5-бальнай сістэме, і калі было зроблена хаця б нешта, то адзнака выстаўлялася. Сёлета пераможцамі сталі тыя, хто набраў больш за 50 працэнтаў ад максімальнай сумы балаў. Такіх аказаўся 61 чалавек. З іх 24 — вучні ліцэя №1. Гэта сведчыць, што тут выкладаюць цудоўныя настаўнікі фізікі. І я хачу выказаць ім вялізную падзяку за добрую падрыхтоўку дзяцей.

Дэкан рэдыёфізічнага факультэта прызнаўся, што сёння ў цэлым па рэспубліцы ўзровень падрыхтоўкі дзяцей па фізіцы і матэматыцы, на жаль, падае, і гэта — галаўны боль тых, хто адказвае за падрыхтоўку кадраў у краіне. «Удзел вялікай колькасці вучняў ліцэя №1 у алімпіядзе і перамога 24-х — гэта бліскучы вынік!» — сказаў ён.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Настаўнік фізікі вышэйшай катэгорыі Уладзімір Міхайлавіч ГРЭБЕНЬ і адзінаццацікласнік Уладзіслаў ПАПОЎ.

«Я захацеў паказаць зоркі дзяўчыне»

— Большая частка выпускнікоў нашых фізіка-матэматычных класаў па-ранейшаму паступае ў БДУІР і знаходзіцца там у ліку найбольш моцных студэнтаў. Але мы паспяхова развіваем і іншыя прафілі, — расказаў **дырэктар ліцэя №1 Мікалай КАРЛОЎСКІ**. — Дзякуючы **настаўнікам вышэйшай катэгорыі Віктару ВОБЛАВУ, Таццяне МАРЫНКІНАЙ** і іх калегам, у нас вельмі моцным лічыцца хіміка-біялагічны профіль. Сёлета абсалютным пераможцам на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі стаў вучань настаўніка фізікі Уладзіміра ГРЭБЕНЯ. Амаль 99 працэнтаў нашых выпускнікоў становяцца студэнтамі ВНУ, прычым, як правіла, бюджэтных аддзяленняў.

Сёлета асаблівую ўвагу да сябе адчуў, напрыклад, **вучань 11 класа Уладзіслаў ПАПОЎ, абсалютны пераможца конкурсу навукова-тэхнічнай творчасці вучняў Саюзнай дзяржавы «Таленты XXI стагоддзя» (Санкт-Пецярбург).**

— Хто цябе зацікавіў астраноміяй? — пытаюся ў юнака.

— Гэта адбылося мінулым ліпенем, калі я захацеў дзяўчыне паказаць зоркі...

— Дзяўчына ацаніла?

— Вядома!

— І куды ты збіраешся паступаць?

— У мяне некалькі перспектыўных прапаноў. Мяне запрасілі ў Маскву і Варшаву, але мне не хочацца нікуды з'язджаць, і я думаю, што паступаць буду ў Мінску, а потым пагляджу. Пакуль я перад выбарам: радыёфізічны, фізічны і механіка-матэматычны факультэты БДУ.

Вершы і астрафізіка

— Гэта далёка не адзіная гучная перамога нашых дзяцей, — заўважыў **настаўнік вышэйшай катэгорыі Уладзімір ГРЭБЕНЬ.** — **Вучань 10-га класа Андрэй КАЛЯЧКА** нядаўна заваяваў ганаровы тытул **«Дзіця новага пакалення» ў тэлевікторыне** «ЛАДа». Ён павінен быў прадэманстраваць агульную эрудыцыю і досыць глыбокія веды па ўсіх дысцыплінах. Яму падарылі нетбук, а нашаму ліцэю — пяць камп'ютараў.

Толькі падапечныя Уладзіміра Грэбеня летась на раённай алімпіядзе ўзялі шэсць першых месцаў, на гарадской — 2 дыпломы другой ступені, 2 — трэцяй і 2 пахвальныя водгукі. У 2009 годзе яго вучань Зміцер Емяльянаў атрымаў бронзавы медаль на міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы ў Іране... Сёння малады чалавек вучыцца на факультэце прыкладной матэматыкі БДУ, на які яму дастаткова было толькі падаць дакументы.

Пытаюся ва Уладзіміра Міхайлавіча, як яму ўдаецца зацікавіць дзяцей астраноміяй пры нагрузцы — 1 гадзіна на тыдзень.

— Гэта насамрэч не складана, — усміхаецца настаўнік. — Бо ў кожным чалавеку закладзена патрэба ведаць пра тое, што робіцца на нябёсах, і пра тое, што нас чакае. А калі цікаўнасць прачынаецца не адразу, імкнуся разгледзець у дзіцяці тое, што яму цікава, і выкарыстаць гэта на карысць сваіх прадметаў. Напрыклад, даведаўся, што адзін з вучняў піша вершы, і прапанаваў яму напісаць верш на астранамічную тэму. Калі ён прыйшоў да мяне з творам, ён кажа: «Уладзімір Міхайлавіч, я затраціў столькі часу, каб даведацца пра тое, пра што напісаў, што лягчэй было б вывучыць на памяць тры параграфы!» Верш, дарэчы, ён добры напісаў.

— Сюды дзеці прыходзяць падрыхтаваныя?

— Апошнія гады мы бяром практычна ўсіх. Зміцер Емяльянаў у свой час спрабаваў паступіць у гімназію і не паступіў, потым — у ліцэй БДУ, і таксама не паступіў. А потым ён прыйшоў да нас і паказаў вынік лепшы, чым яго канкурэнты.

...Учора ў Ліцэі № 1 для 224 таленавітых маладых людзей прагучаў апошні званок. Галоўныя іх перамогі ў жыцці — яшчэ наперадзе. Але, несумненна, гэты адрас на праспекце «Звязды» заўсёды будзе для іх адным з самых хвалюючых на ўсёй планеце.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«ЗА ЗАХОЎВАННЕ ДРОБНАРАЗМЕННАЙ МАНЕТЫ»

З такой дзівоснай фармуліроўкі пачалося ўзыходжанне на Галгофу святара Аляксія Магільніцкага, зусім нядаўна праслаўленага святога беларускай праваслаўнай царквы. За такое «злачынства» ў 1930 годзе ён быў асуджаны народным судом на адзін месяц прымусовых работ. Яго лёс — адзін з прыкладаў подзвігу спаведніцтва, кажа протаіерэй Аляксандр Лапушанскі, які на працягу пяці гадоў у розных архівах Мінска, Гомеля і Мазыра збіраў матэрыялы для кананізацыі і падрабязна вывучаў біяграфію айца Аляксія.

Для нас сёння малазразумела, чаму чалавека звычайнага жыцця (так здаецца многім) царква вылучае і ставіць на асобнае месца. Тым больш што ў вядомыя гады багаборніцтва многія людзі пацярпелі ад афіцыйных улад, якія адкрыта не падзялялі поглядаў з вернікамі. Але ж далёка не ўсе сярод пацярпелых праслаўлены як святыя. У чым розніца?

Сабраныя архіўныя матэрыялы сведчаць, што з 1893 года святар узорна служыў у Ражства-Багародзічнай царкве сяла Вялікі Бор Рэчыцкага павета і Туркаўскай царкве Бабруйскага павета. Потым, на працягу 13 гадоў, айцец Аляксій служыў у Мазырскім Свята-Міхайлаўскім саборы і адначасова выкладаў Закон Божы ў мясцовых жаночай гімназіі і мужчынскім прыходскім вучылішчы. У 1912 годзе яго сям'ю спасцігла вялікае гора: святар застаўся ўдаўцом з пяццю дзецьмі на руках. Яго жонка Настасся памерла ва ўзросце 37 гадоў. Нягледзячы на гэтае выпрабаванне, ён змог выхаваць сваіх дзяцей і даць ім добрую адукацыю.

А вось у 1920 годзе, пасля Мазыра, айца Аляксія перавялі ў мястэчка Лельчыцы Мазырскага павета. Храм у Лельчыцах, дзе служыў святар, быў асвечаны ў гонар Найсвяцейшай Тройцы. Кампанія па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцяў, якая праходзіла ў 20-30 гады XX стагоддзя, не абышла і Траецкую царкву, якую ўрэшце, восенню 1935 года, закрылі. Храм, па традыцыі тых часоў, ператварылі ў зернясховішча.

Антырэлігійная агітацыя набірала абароты і давала свае горкія плады. Вось некаторыя лічбы. Калі ў 1917 годзе ў Лельчыцкім прыходзе налічвалася 4539 праваслаўных жыхароў, то да 1925 года іх колькасць скарацілася да 2416 чалавек. Тым не менш свайго пастырскага служэння святар Аляксій Магільніцкі не пакінуў. Лічыцца, што прызванне на служэнне ў перыяд лютага ганення на царкву — залог святасці. Протаіерэй Аляксандр Лапушанскі нагадвае словы з Евангелля: «...каго Ён прадвызначыў, тых і заклікаў, а каго заклікаў, тых і апраўдаў; а каго апраўдаў, тых і ўславіў» (Рым. 8, 30). Вось і святар Аляксій пасля закрыцця храма працягваў здзяйсняць набажэнствы на сваёй кватэры. А гэта ў той час лічылася сур'ёзным парушэннем закона.

З пратакола допыту: «Рэлігійныя абрады да восені 1935 года ажыццяўляў у Лельчыцкай цэркве, а пасля гэтага пачаў праводзіць на сваёй кватэры, а іменна: водахрышчэнне нованароджаных, памінанне памерлых і г.д.». Да яго прыходзіла шмат людзей. Гэта былі не толькі жыхары Лельчыцаў, але і навакольных вёсак. І нікому ён не адмаўляў. Яго дом фактычна быў пераўтвораны ў царкву. Вядома, гэта не магло добра закончыцца. Улады, якія паступова змагаліся з «опіумам для народа», звярнулі асаблівую ўвагу на дзейнасць святара з глыбінкі Палесся. Гэта ж стала нагодай для сістэматычных правакацый — абвінавачвання айца Аляксія ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Яго арыштавалі ў жніўні 1937 года. Падставай паслужыў і той факт, што 1 мая 1937 года (на гэты дзень прыйшлося ў той год свята Пасхі Хрыстовай), недалёка ад Лельчыцаў, у вёсцы Сіманічы жанчыны зламалі замок на царкве, якая таксама была зачынена, і пачалі там маліцца. Улады вырашылі, што айцец Аляксій з'яўляўся кіраўніком гэтых верніц.

Для кананізацыі асабліва важным фактам стала тое, што падчас шматлікіх допытаў святар не толькі не прызнаў сябе вінаватым, але нікога не агаварыў, не назваў ніводнага прозвішча. Такім чынам, падкрэслівае протаіерэй Аляксандр Лапушанскі, святар нават словам не прынёс ніякай шкоды ніводнаму чалавеку. Нягледзячы ні на што, абвінавачванне яму было вынесена. Прыгавор прымеркавалі да 27 верасня, дня, калі царква святкуе Узвіжанне Крыжа Гасподняга. А 20 кастрычніка 1937 года айца Аляксія расстралялі. Не выключана, што гэта адбылося ў Свята-Міхайлаўскім саборы Мазыра, дзе ў той страшны час была размешчана турма НКУС Палескай вобласці.

Дакумент, згодна з якім 67-гадовага святара пазбавілі жыцця, утрымлівае стандартны для тых часін набор: «З'яўляючыся ўдзельнікам контррэвалюцыйнай групоўкі, сістэматычна ўзводзіў паклёп на Савецкую ўладу, усхваляў жыццё фашысцкай Польшчы і Нямеччыны, праводзіў актыўную агітацыю супраць усіх мерапрыемстваў партыі і ўрада, якія праводзяцца ў вёсцы, заклікаючы калгаснікаў да выхаду з калгаса. Распаўсюджваў правакацыйныя чуткі пра хуткую вайну і паражэнне ў ёй Савецкай улады, уладкоўваў нелегальныя зборы, дзе праводзіў контррэвалюцыйную работу».

Праз паўстагоддзя справядлівасць у дачыненні да айца Аляксія была адноўлена. Протаіерэй Аляксандр Лапушанскі не лічыць выпадковасцю тое, што пасмяротная рэабілітацыя прыйшлася на 7 чэрвеня 1989 года. У гэты дзень царква ўзгадвае Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы.

Свой крыж святар Аляксій Магільніцкі вынес дастойна. Менавіта таму за мужнасць і цярпенне праслаўлены ў ліку святых новамучанікаў і цяпер да яго, святога Аляксія, прасвітара Лельчыцкага, звяртаюцца ў сваіх малітвах вернікі. А ў вёсцы Сырад Калінкавіцкага раёна будуецца новы храм, які будзе прысвечаны свяшчэннапакутніку Аляксію Магільніцкаму.

Між тым, па праслаўленні епіскапа Тураўскага і Мазырскага Стэфана ў крыптавым храме Свята-Міхайлаўскага кафедральнага сабора Мазыра былі ўстаноўлены 50 лампад у памяць пра нявінна забітых у гады ліхалецця. Там жа сабраны ў дзве труны каля 60 чарапоў і косткі людзей, якія знайшлі пры ачышчэнні склепаў сабора. Гэты галоўны храм Палесся валодае такімі тайнамі, расказаць пра якія трэба асобна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Фестывалі

БЕРЛІНСКІ НАПРАМАК

Голас Беларусі пачуюць на Сусветным фестывалі культур у Германіі

Гэта ж трэба — мы там будзем!.. Як народ, як краіна. Уявіце: нашы ў белых строях з беларускім арнаментам, а навокал усе такія стракатыя — нібыта ў адной кропцы сышліся ўсе кантыненты. Гукі і песні, якія чуеш упершыню, дзіўныя інструменты, пра існаванне якіх толькі здагадваўся, у руках музыкаў малююць вобразы іх краін. Водар і смаката самых экзатычных — для нас і не толькі — страў. Берлінскі фестываль — своеасаблівая дэманстрацыя шматаблічнасці і культурнага багацця свету. Тут сыходзіцца Еўропа з Азіяй — не геаграфічна, а фактычна, праз людзей. Тут Афрыка і Амерыка побач — таму што іх прадстаўнікі разважаюць пра тое, што яднае людзей, а не наадварот. Таму што сусветны форум культур адбываецца ў падтрымку міру: больш за 150 краін-удзельніц прадставяць сябе — у танцах, музыцы, спевах, нацыянальнай кухні. І хоць яшчэ ёсць час (да 2-3 ліпеня), дэлегацыя нашай краіны ўжо рыхтуецца. Але сусветны форум — значыць адкрыты. Значыць, кожны, хто захоча стаць маленькай часцінкай гэтай дэлагацыі, можа патрапіць сёлета ў Берлін. А вось як і дзеля чаго — распавядае арганізатар у Рэспубліцы Беларусь Ігар САРОКА:

— Наша краіна рыхтуецца прыняць удзел у Сусветным фестывалі культур у Берліне ўпершыню. Таму нам важна пра сябе заявіць і годна сябе прадставіць. Тым больш, што на стадыёне «Алімпія» ў Берліне ў першыя дні ліпеня чакаецца каля 70 тысяч гасцей. Яны змогуць наведаць Павільёны Кантынентаў Свету, дакрануцца да прыгажосці розных культур праз зносіны падчас канферэнцый, канцэртаў, нацыянальных прэзентацый з музыкай, танцамі, літаратурай. Сёлета фестываль праводзіцца ў гонар 30-годдзя фонду «Мастацтва жыцця», міжнароднай некамерцыйнай арганізацыі, якая акрэдытавана пры ААН і мае прадстаўніцтвы ў 151 краіне свету, у тым ліку ў Беларусі. Яна была заснавана дзеля ўмацавання міру і распаўсюджвання агульначалавечых каштоўнасцяў. Акрамя таго, сёлета асабліва ўвага будзе нададзена адной з самых старажытных культур — індыйскай. Чакаецца, што толькі з Індыі прыедзе каля 5000 гасцей. Але ўсім месца хопіць — там няма галоўных і не галоўных народаў.

Чатыры Павільёны Кантынентаў Свету павінны размясціцца на маляўнічых зялёных палях вакол стадыёна — такім чынам удзельнікі і госці будуць мець магчымасць пазнаёміцца з культурнай спадчынай краін Афрыкі, Азіяцка-Ціхаакеанскага рэгіёна, Еўропы і Амерыкі. У павільёнах можна будзе пакаштаваць і нацыянальныя стравы розных народаў.

— Беларускія дранікі?

— Чаму не?.. Мы зрабілі заяўку, што ў нас будзе свой кухар, маладая жанчына, якая гатова зрабіць нешта простае. Таму што гэта будзе масавая падзея, калі галоўная задача — даць магчымасць нешта пакаштаваць найбольшай колькасці людзей. Яна сказала, што добра ўяўляе, што трэба прадставіць ад беларускай кухні. Фестываль не прадугледжвае спіртное, таму нашымі нацыянальнымі напоямі могуць быць квас альбо морс. Колькі людзей пакаштуе беларускія стравы? Уявіце, калі на працягу 2-3 дзён 70 тысяч чалавек будуць то падыходзіць, то сыходзіць са стадыёна, то праз нас пройдуць чалавечыя плыні... Але мы ж адной кухняй не абмяжуемся. Беларусь прадставіць фальклорны калектыў БДУ «Багач». У нас ёсць больш вядомыя фальклорныя ансамблі, але ў іх нашмат месяцаў наперад складзены графік выступленняў. Але з другога боку, я добра ведаю калектывы, якія, можа, і не маюць такой вядомасці, але яны могуць быць вельмі цікавыя сваёй праграмай. Акрамя таго, я лічу, што ў маладых артыстаў больш энтузіязму і імкнення выступіць яскрава — а мы ж хочам звярнуць на сябе ўвагу?!.

— Калі гавораць пра Берлінскі фестываль культур, то маюць на ўвазе не толькі гасцей, якія прыязджаюць з-за цікавасці ці па клічы сэрца, але яшчэ і сур'ёзнае міжнароднае прадстаўніцтва.

— Там збіраюцца палітыкі, міратворцы, духоўныя лідары, навукоўцы, кіраўнікі недзяржаўных арганізацый, бізнэс-эліта. Таму што падчас працы фестывалю (наогул галоўнае, дзеля чаго ён ладзіцца) будуць узнімацца тэмы распаўсюджвання ідэй міру ў свеце, пошуку гармоніі ў разнастайнасці. Па маштабе сёлета, напэўна, упершыню ў Еўропе будзе праводзіцца такі буйны форум.

— Што азначае для Беларусі ўдзел у гэтым форуме? Напэўна ж, нешта мы маем на ўвазе, калі прадстаўляем сваю краіну?

— Па-першае, мы прадставім сваю нацыянальную культуру, заявім пра сваю адметнасць у свеце, а дзякуючы гэтаму зацікавім іншых Беларуссю. У сваю чаргу, можам нейкім чынам паўплываць нават на тое, каб прыцягнуць у краіну турыстаў. Зараз гэта вельмі важна і перспектыўна, у сувязі з тым, што даволі плённа развіваецца такі напрамак, як экалагічны турызм. Акрамя таго, паўдзельнічаць у фестывалі, які будзе накіраваны на святкаванне шматаблічнасці культур, — вось гэта вельмі важна. Значыць, беларусы як народ таксама ёсць на карце свету. А калі збіраецца столькі розных народаў разам і імкнуцца спазнаць адзін аднаго, зразумець, то глеба для канфліктаў як такая сціраецца. Людзі знаходзяць агульную мову — у міжканфесійным дыялогу, у палітычных пытаннях, у пытаннях культурнай спадчыны і агульначалавечых каштоўнасцяў.

— Хто можа ад Беларусі патрапіць у Берлін? З каго будзе складацца наша дэлегацыя?

— Мы плануем, што ў склад беларускай дэлегацыі ўвойдзе прыкладна 200 чалавек. Магчыма, сярод іх будуць прадстаўнікі дзяржавы — запрашэнні перададзены. Але ж у нашай краіне ў гэтыя дні сваё свята...

Але ў Берлін могуць паехаць дабравольцы, якія ўдзельнічалі ў сацыяльна значных праектах міжнароднага фонду «Мастацтва жыцця» ў Рэспубліцы Беларусь. У нас ажыццяўляліся розныя праекты. Напрыклад, «Школа без агрэсіі» — агульнасусветная праграма, якая дапамагае дзецям, падлеткам, спраўляцца з агрэсіяй, са стрэсамі, з вялікай плынню інфармацыі ў школе і навокал. Ёсць падобныя курсы для падлеткаў і моладзі, якія дапамагаюць выявіць лідарскія якасці, больш адаптавана весці сябе ў грамадстве. Таксама і моладзь, і дарослыя ўдзельнічаюць у розных агульных праектах, як мы рабілі «Чысты горад». Ці калі наведвалі Домы састарэлых, інвалідаў, дзіцячыя дамы. Аснова нашай працы — дапамога чалавеку, які не мае апоры ў гэтым свеце, дабрачыннасць. З пачатку 2000 года мы адкрылі цікавы праект, які называецца «Свабода ў турме», праводзілі антыстрэсавыя трэнінгі для зняволеных — гэта адна з праграм па іх рэабілітацыі. Удзельнічалі ў місіі «Зялёная планета», якая ладзілася па ініцыятыве ААН, пасадзілі шмат дрэў і кустоў.

Так, гэты фестываль, з аднаго боку, прадстаўляе краіну. А з другога боку, кожны, хто жадае, можа туды паехаць па ўласнай ініцыятыве. Арганізатары фестывалю з Берліна даслалі больш за 100 запрашэнняў для тых, хто жадае паехаць. Не будзе перашкод, каб бясплатна адкрыць візу для тых, хто збіраецца на фестываль. Арганізатары далі цэлы пералік атэляў, дзе можна спыніцца (зусім недарагіх — ад 9 да 35 еўра ў суткі). Побач са стадыёнам на зялёных палях будуць прадавацца стравы розных кухняў — ад 2 да 7 еўра. Так што з пражываннем і харчаваннем праблем быць не павінна. Каля 30 еўра будуць каштаваць квіткі на ўсе мерапрыемствы, прычым ты можаш там прысутнічаць з ранку да вечара. Ёсць адзіны білет на ўвесь фестывальны час. Білеты даўно ў продажы, але іх можна набыць на сайце: www.worldculturefestival.org

— Чым цікавы гэты форум для вас, як для чалавека?

— Я лічу, што тое, што кожны з нас носіць у сваёй свядомасці і сваім сэрцы, аказвае пэўны ўплыў на грамадства ў цэлым. Ёсць выраз «прыватнае жыццё». Я не лічу, што ёсць прыватнае жыццё. Тваё прыватнае жыццё заўсёды на нечым замыкаецца і некага закранае — ці то гэта сям'я, ці месца працы, ці грамадства, у якім існуеш. Таму для сябе я чакаю атрымаць нейкую новую інфармацыю пра наш вялікі свет. Гэта стане часткай майго досведу, часткай духоўнага росту, калі хочаце. Гэта дазволіць, магчыма, потым запрашаць прадстаўнікоў розных культур у Беларусь. І гэта проста грандыёзная падзея, на якую вельмі хочацца паглядзець.

Ларыса ЦІМОШЫК.

На свае вочы

ХОЧАШ ЖЫЦЬ — УМЕЙ...

ПАВОДЛЕ вядомай прыказкі, трэба ўмець «круціцца» — гэта значыць прыстасоўвацца да сённяшніх рэалій з выгадай для сябе. Як гэта робіцца — можна штодзённа бачыць, напрыклад, непадалёк ад Гродна, у памежным з Літвой пункце пропуску «Прывалка». Нядаўна па дарозе ў Друскенінкай карэспандэнт «Звязды» прытармазіў там на пяць гадзін, прычым менавіта з-за гэтага ўмення іншых «круціцца». З аднаго боку — страта часу, а з іншага — карцінкі з натуры для журналісцкага блакнота пра жыццё нашых суседзяў — літоўцаў. Ну, хіба ж яны, увайшоўшы ў Еўрасаюз, сталі для нас зусім чужымі?

У тым, што гэта не так, пераконвае выпадковая сустрэча з жыхаром Алітуса Ёзасам, які стаў у аўтамабільную чаргу адразу пасля мяне. Па-руску ён размаўляе амаль без акцэнту, бо за савецкім часам, працуючы ў аддзеле забеспячэння аднаго з буйных літоўскіх прадпрыемстваў, пабываў у многіх рэгіёнах былога СССР. Цяпер Ёзас на пенсіі (сёлета адзначыць сямідзесяцігадовы юбілей) і неўзабаве хоча паехаць у Калінінград да расіяніна, з якім сябруе з часоў службы ў Савецкай Арміі. А ў беларускіх «Прывалках» ён, у адрозненне ад аўтара гэтых радкоў, бывае ледзь не штодзённа, а то і двойчы на дзень. Дзякуй, кажа, Богу і сямейнаму доктару (яго праца фінансуецца з бюджэту), што здароўе пакуль дазваляе.

Помнік мастаку і кампазітару Мікалоюсу Канстанцінасу Чурлёнісу. Ён, дарэчы, таксама, як і сённяшнія «чаўнакі», часта бываў на Гродзеншчыне, а яго цешча — родам з-пад Мінска.

Уласна кажучы, менавіта з-за Ёзаса і іншых літоўцаў і ўтварылася чарга ў пункце пропуску, бо машын з беларускімі нумарамі было зусім мала. У асноўным — літоўскія аўтамабілі, прычым, як правіла, маркі «Фальксваген - Пасат», вельмі папулярныя сярод перавозчыкаў паліва па прычыне ўмяшчальных бензабакаў.

— Працую ў Аляксандра Рыгоравіча, — жартуе Ёзас. — За месяц «экспартаваў» з Беларусі прыкладна дзве тоны саляркі. Выгадна і мне, ды і, напэўна, вам, бо разлічваюся ж валютай.

Як і дзясяткі іншых літоўцаў, сярод якіх, дарэчы, у аўтамабільнай чарзе можна было ўбачыць нямала жанчын.

Праблем з абменам літаў на еўра ці долары (хоць апошнія ў Літве не ў пашане) няма, валютны курс стабільны. А што тычыцца разліку за паліва ў Беларусі, то, зразумела, у цяперашняй сітуацыі не кожны літовец пакідае свае еўра на аўтазаправачных станцыях альбо ў абменніках. Для гэтага, напрыклад, у Ёзаса ёсць знаёмы гродзенец Віця, які мяняе яму валюту на беларускія рублі па ўзаемавыгадным курсе. Вядома, гэта можна назваць незаконнай валютнай аперацыяй. А з іншага боку, «літоўскія» еўра не вывозяцца з Беларусі, а няхай не афіцыйна, але ўсё ж да нас увозяцца.

У той дзень Ёзас выехаў з дому ў пяць гадзін раніцы (да літоўска-беларускай мяжы — прыкладна 80 кіламетраў), каля васьмі гадзін быў ужо з поўным бакам дызпаліва на нашай тэрыторыі, у пункце пропуску «Прывалка», і разлічваў, што, даставіўшы салярку па прызначэнні (ёсць пастаянныя спажыўцы), зробіць яшчэ адзін рэйс у Беларусь. Пасля чаго — вымушаны перапынак на афармленне чарговай беларускай візы, Ёзас спадзяецца, што гэта зойме не больш за тыдзень.

Але чаму ж у, скажам так, не надта маладым узросце Ёзас (неяк ненатуральна казаць пра такога энергічнага чалавека — «на старасці гадоў») матаецца праз мяжу з гэтай саляркай? Адказ відавочны: гэта дае прыбаўку, і даволі значную, да пенсіі. А для многіх маладзейшых «калег» Ёзаса бізнэс на беларускім паліве — асноўная праца. Бо іншая ў тым жа Алітусе, паводле яго слоў, практычна адсутнічае. Ледзь не ўся пабудаваная за савецкім часам прамысловасць знішчана, а новага за дваццаць гадоў незалежнасці амаль нічога не стварылі. І сёння гэта, па сутнасці, горад пенсіянераў без перспектыў для моладзі. Таму многія людзі маладога альбо сярэдняга ўзросту з'ехалі ў іншыя краіны Еўрасаюза (напрыклад, дачка Ёзаса з мужам — у Іспанію), альбо зарабляюць вось такім «салярачным» бізнэсам.

І не толькі ім. Напрыклад, непадалёк ад Друскенінкая, у мястэчку Грутас, у маі з ночы выстройваліся чэргі каля варот кампаніі, якая займаецца перапрацоўкай грыбоў, ягад і смаўжоў. За тыдзень там скупілі амаль 300 тон смаўжоў, прычым прадаваць іх прыязджаюць у Літву нават палякі і латышы. Далікатэсная прадукцыя пастаўляецца на экспарт у шэраг краін Еўрасаюза, а пастаўшчыкі сыравіны чакаюць дажджу, які гарантуе добры ўраджай смаўжоў і някепскія даходы.

Дарэчы, у той жа дзень, калі мы з Ёзасам гутарылі ў чаканні перасячэння мяжы, літоўскія газеты паведамілі аб афіцыйных звестках перапісу насельніцтва Літвы. Дык вось, па стане на 1 сакавіка сёлетняга года, у краіне, па падліках Дэпартамента статыстыкі, пражывала 3 053 800 жыхароў. Тады як дзесяць гадоў таму пастаяннае месца жыхарства на тэрыторыі Літвы дэкларавалі больш за 3,7 мільёна чалавек. Ні ў адной іншай краіне Еўрасаюза колькасць насельніцтва не скарачаецца так хутка — эксперты ў галіне дэмаграфічнай палітыкі называюць такую сітуацыяй катастрафічнай. Выказваюцца нават ацэнкі, што краіна зараз знаходзіцца за крок ад Рубікона, за якім пачынаецца знікненне нацыі.

Толькі за чатыры месяцы сёлета Літва ў выніку адмоўнага прыросту насельніцтва пазбавілася чатырох тысяч жыхароў, а яшчэ 18 тысяч выехалі за мяжу. Калі такія тэндэнцыі захаваюцца, то да канца года насельніцтва краіны скароціцца на 50— 60 тысяч чалавек. А тут яшчэ Германія з Аўстрыяй адкрылі з 1 мая свае рынкі для дадатковай рабочай сілы з Усходняй Еўропы, прычым асаблівы попыт менавіта на кваліфікаваныя кадры — напрыклад, інжынераў. Значыць, вецер эміграцыі выдзьме з Літвы і іх?

Хоць гучаць і іншыя галасы. Маўляў, эмігрантам трэба ледзь не рукі цалаваць, бо яны штогод высылаюць сваім сем'ям больш за чатыры мільярды літаў.

Але вернемся да размовы з Ёзасам. Кошт бензіну дасягае ў Літве амаль двух долараў, што і робіць выгадным для «чаўнакоў» памежны бізнэс. І гэта пры наяўнасці на тэрыторыі суседзяў буйнога нафтакомплексу — Мажайкяйскага НПЗ, які ў 1999 годзе прадалі амерыканскай кампаніі. Гэтая здзелка расцэньваецца цяперашняй уладай як надзвычай нявыгадная для Літвы, паколькі дзяржава не атрымала ад яе грошай, а толькі вялізныя абавязацельствы, частка якіх дзейнічае аж да 2025 года. А цэнавая і акцызная палітыка такая, што мажайкяйскае паліва, кажа Ёзас, танней купіць у Латвіі і Эстоніі, чым у Літве, дзе яно вырабляецца.

У такой сітуацыі, зразумела, кіроўцы шукаюць альтэрнатыўныя варыянты набыцця гаручага (у параўнанні з 2008 годам продаж бензіну скараціўся больш чым на 60 працэнтаў, хоць працуючых на ім аўтамабіляў менш не стала), маюць выгаду з яго перавозчыкі з Беларусі і Расіі, а літоўскі ўрад заяўляе, што гэта шкодзіць эканоміцы краіны і спрабуе неяк абмежаваць нелегальны гандаль палівам. Літаральна напярэдадні гэтай паездкі, кажа Ёзас, па тэлебачанні прайшла інфармацыя аб больш жорсткіх правілах перасячэння літоўска-беларускай і літоўска-расійскай меж. Бясплатны правоз гаручага ў баках будзе дазволены толькі пяць разоў у месяц, а з шостага прыйдзецца заплаціць падаткі. Плануецца, што нумары машын будуць счытвацца аўтаматычна, а мытнікі пракантралююць, колькі паліва ў баках.

— Нашы «рабочыя конікі» са сталітровымі бакамі могуць рэзка патаннець, — усміхаецца Ёзас.

...На беларускай мытні аўтамабілю, які быў перад намі, загадана ад'ехаць убок. Пэўна, кіроўцу тут ужо ведаюць і нешта насцярожвае. А вось да Ёзаса пытанняў у беларусаў няма. Развітваемся з ім мы ўжо на літоўскай мытні, дзе мне — па адным канале, а Ёзасу, як «еўрасаюзаўцу» — па іншым. Ён — дахаты ў Алітус, а я — у госці ў Друскенінкай, дакладней, у санаторый «Беларусь».

Што ўяўляе сёння сабой адна са старэйшых здраўніц знакамітага літоўскага курорта? Якія паслугі прапаноўваюцца і наколькі яны запатрабаваны? Зрэшты, гэта ўжо іншая гісторыя, пра якую — у адным з бліжэйшых нумароў «Звязды».

Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота аўтара.

Жывая зямля

АСЦЯРОЖНА, ПАД НАГАМІ ПАДЛЁТКІ!

ПАЧАТАК лета — час вылету з гнёздаў першых птушанят. Маладняк шпакоў, драздоў, сінічак і іншых маленькіх птушак вось-вось пачне першыя палёты.

Звычайна ўзрост птушкі, калі яна ўпершыню спрабуе крыло, каля двух тыдняў. Нярэдка першая спроба аказваецца апошняй. Упаўшы на зямлю, птушаня можа лёгка стаць здабычай дзікіх жывёл. А калі гэта здараецца ў гарадскім парку, пагроза сыходзіць ад бадзяжных кошак і сабак. Што рабіць, калі вам раптам давядзецца ўбачыць на зямлі птушаня, якое яшчэ не зусім аперылася? Ці трэба яго забіраць дадому і спрабаваць выходжваць самому? Многія лічаць, што птушаня выпадкова выпадае з гнязда і яго чакае пагібель. Але гэта не зусім так. Калі птушаняты падрастаюць, ім сапраўды цесна ў гняздзе, і яны пачынаюць спачатку садзіцца на сусед

Вопыт, варты пераймання

МЯСЦОВАЕ БАГАЦЦЕ

З беларускіх лясоў і палеткаў, з драўніны і саломы

Лясны масіў каля вёскі Заполле Мастоўскага раёна сустракае генеральнага дырэктара камунальнага ўнітарнага прадпрыемства па забеспячэнні палівам «Гроднааблпаліва» Віктара НІКАЛАЙЧЫКА, галоўнага інжынера Уладзіміра ГУЗЕНЯ і аўтара гэтых радкоў моцнай «атакай» камароў, да чаго ў гэтыя дні ўжо прызвычаіліся спецыялісты брыгады па вырабе дранкі — мясцовага паліва з драўніны. Гэтая прадукцыя, якая яшчэ некалькі гадоў таму з'яўлялася для Беларусі навінкай і некаторымі гаспадарнікамі ўспрымалася насцярожана, з пэўным скепсісам, сёння літаральна нарасхват у кацельнях ЖКГ.

Так, можна было б і надалей спадзявацца выключна на прыродны газ (а Гродзенская вобласць самая газіфікаваная ў рэспубліцы: летась у паліўным балансе рэгіёна — 81,8 працэнта), але трэба лічыцца з эканамічнымі рэаліямі, з энергетычнай бяспекай краіны, якая не можа залежаць ад аднаго віда рэсурсаў. І ўжо цяпер відавочна, што тая ж дранка складае ў кацельнях жыллёва-камунальнай гаспадаркі даволі дастойную альтэрнатыву «блакітнаму паліву». І нішто не сведчыць, што ў перспектыве ў сувязі з коштам прыроднага газа стане інакш. Больш за тое, можна спрагназаваць, што гэта мясцовае паліва з кожным годам будзе яшчэ больш запатрабаваным — і не толькі на нашым унутраным, але і на знешніх рынках.

Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся, чым жа можа быць карысным для іншых досвед адных з першапраходцаў па вытворчасці паліўнай дранкі.

Паводле слоў **дырэктара Мастоўскага філіяла КУП «Гроднааблпаліва» Уладзіміра ДАНІЛЬЧЫКА**, брыгады па вырабе дранкі ўжо даўно не прастойваюць без справы, даводзіцца працаваць нават у выхадныя. Напрыклад, літаральна паўгадзіны таму адзін «дранкавоз» накіраваўся ў Скідаль — і адразу ж пад загрузку стаў другі. Тэхніка надзейная, зарплата ў брыгадзе па нарыхтоўцы дранкі часам перавышае 2 мільёны рублёў, а эканамічнае становішча філіяла ў цэлым дзякуючы гэтай прадукцыі палепшылася так, што прадпрыемства стала адным з лепшых у раёне.

Не абцяжарваючы чытачоў тэхналагічнымі нюансамі, паведамім толькі, што наша мясцовая дранка «пачынаецца» з нарыхтоўкі драўніны, а затым вальшчыкі перадаюць «эстафету» аператарам пагрузачна-транспартных і рубільнай машын. На перапрацоўку бярвёнаў, вывезеных з лесу на бліжэйшую, зручную для пад'езду пляцоўку ля вёскі Заполле, патрабуецца прыкладна тыдзень. Пасля чаго тэхніка накіруецца ў іншыя раёны Гродзеншчыны, дзе ўжо паклапаціліся аб нарыхтоўцы сыравіны для дранкі.

Генеральны дырэктар КУП «Гроднааблпаліва» Віктар НІКАЛАЙЧЫК (злева) і дырэктар Мастоўскага філіяла Уладзімір ДАНІЛЬЧЫК.

А пачыналася з ініцыятывы кіраўніцтва КУП «Гроднааблпаліва», з разумення таго, што жыць на старым «багажы» ўжо нельга.

— У 2007 годзе пры падтрымцы аблвыканкама і Дэпартамента па энергаэфектыўнасці наша прадпрыемства ўключылі ў рэспубліканскую праграму па вытворчасці паліўнай дранкі на Гродзеншчыне, — расказвае Віктар Нікалайчык. — Азнаёміліся з адпаведным досведам у рэспубліцы і за мяжой, вызначыліся з найлепшым у нашых умовах абсталяваннем, а міжраённую брыгаду па вытворчасці і дастаўцы дранкі да кацельняў ЖКГ стварылі на базе Мастоўскага філіяла па меркаваннях найбольшай эфектыўнасці. Набылі ўсю неабходную тэхніку, абучылі кадры вальшчыкаў, аператараў пагрузачна-транспартных і рубільнай машын, стварылі пяць брыгад па нарыхтоўцы драўніны ў Ваўкавыску, Зэльве, Мастах і Гродне, атрымалі ліцэнзіі на ўсе віды дзейнасці. Увогуле на гэты праект затрачана каля 2,3 мільярда рублёў з трох крыніц — інавацыйных фондаў Мінэнерга і аблвыканкама, а таксама за кошт уласных сродкаў прадпрыемства.

Сёння геаграфія вытворчасці паліўнай дранкі значна пашырана і ахоплівае, акрамя вышэйзгаданых, Слонімскі, Бераставіцкі, Карэліцкі і Навагрудскі раёны. Лесанарыхтоўчыя брыгады стварылі таксама ў Смаргоні і Свіслачы. Такі падыход, на думку Віктара Нікалайчыка, апраўданы як з пункту гледжання стабільных саманарыхтовак драўніны, так і дзеля паляпшэння эканомікі. Па-першае, гэта танней, чым карыстацца «чужымі» пастаўкамі, а па-другое, на лесасеках (як выдзеленых лясгасамі, так і купленых на таварнай біржы) сустракаецца дзелавая драўніна, рэалізацыя якой таксама прыносіць даходы прадпрыемству. Больш за тое, гэта дазволіла арганізаваць экспартныя пастаўкі дроў у Еўропу.

Для даведкі:

У 2010 годзе міжраённай брыгадай КУП «Гроднааблпаліва» на рубільнай машыне HEM-420D нямецкай фірмы «Jenz» выраблена 31,7 тысячы шчыльных кубаметраў паліўнай дранкі — лепшы вынік сярод аналагічнай тэхнікі ў краіне. Гэтая вытворчасць забяспечыла прадпрыемству прыбаўку да агульнага аб'ёму тавараабароту і паслуг амаль на 2 мільярды рублёў (8,5 працэнта).

Цяпер Віктар Нікалайчык марыць аб набыцці яшчэ адной рубільнай машыны, каб пашырыць вытворчасць паліўнай дранкі — у інтарэсах і прадпрыемства, і ўсёй краіны. Зрэшты, не дранкай адзінай ... Развіваемся з мастаўчанамі і накіроўваемся ў Зэльву, каб азнаёміцца з яшчэ адным, раней нетрадыцыйным відам прадукцыі з мясцовай сыравіны.

Зэльвенскі драўняны вугаль.

Карэспандэнт «Звязды» прыязджаў у Зэльвенскі філіял КУП «Гроднааблпаліва» пяць гадоў таму, калі там не абмежаваліся ўжо звычнымі торфабрыкетам і дровамі, а заналіся яшчэ і вырабам драўнянага вугалю. Цікаўлюся ў **дырэктара філіяла Чэслава БУСЛОВІЧА**, ці не шкадуе ён, што ўзяўся за гэту справу. У адказ — лічбы, якія сведчаць, што драўняны вугаль — сапраўды тавар шырокага народнага спажывання, вельмі запатрабаваны аматарамі шашлыкоў і іншых страў. На складзе ён не залежваецца і рэалізуецца па ўсёй вобласці — у крамах, на аўтазаправачных станцыях. Будзе яшчэ больш рэтортаў (абсталявання па вытворчасці драўнянага вугалю) — дык, пэўна, не толькі ўнутраны рынак гэтай прадукцыяй забяспечаць, але і атрымаюць выгаду з экспарту.

Для даведкі:

У 2006 годзе прадалі 58 тон драўнянага вугалю, а летась, калі колькасць рэтортаў павялічылася да шасці — 152 тоны, на 350 мільёнаў рублёў. Прыбаўка па валу тавараў і паслуг у Зэльвенскім філіяле за мінулы год склала 10, а па прыбытку — амаль 23 працэнты. Да таго ж дзякуючы драўнянаму вугалю створана 12 новых рабочых месцаў.

...Усё гэта пра што? Ды пра тое, мусіць, што так і павінны сёння працаваць сапраўдныя гаспадарнікі. Не чакаць лепшай кан'юнктуры аднекуль «зверху», а вывучаць перадавы вопыт, бачыць рэзервы ў сябе і граматна іх задзейнічаць. Так, імгненнай выгады не будзе, новае — гэта заўсёды рызыка, пралікі, нервы, і рэальны вынік зусім не гарантаваны. Але, як сведчаць тыя ж паліўная дранка і драўняны вугаль у «выкананні» КУП «Гроднааблпаліва», цалкам магчымы.

Варта дадаць, што ўсе філіялы прадпрыемства цяпер аснашчаны новым абсталяваннем на распілоўцы і колцы дроў. У гэтым — таксама рэальная эканоміка, бо прадукцыйнасць у паўтара раза вышэйшая, чым раней, а энергіі спажываецца на столькі ж менш. У выніку павялічыўся прыбытак ад паслуг па дровах. Плюс бяспека, мінімум фізічнай працы. Паклапаціліся і пра тое, каб зрабіць больш таннай дастаўку паліва насельніцтву: кузаў самазвала дзеляць на дзве часткі і вязуць дровы альбо торфабрыкет адным рэйсам дваім домаўладальнікам.

...Цяпер на парадку дня прадпрыемства — чарговы праект па мясцовых, альтэрнатыўных прыроднаму газу відах паліва. На гэты раз справе энергетычнай бяспекі краіны і, безумоўна, эканомікі вытворцаў павінна паслужыць салома, якой на Гродзеншчыне з яе высокімі ўраджаямі хапае. На базе Навагрудскага філіяла працуюць па асваенні выпуску з саломы паліўных пелетаў (гранул). Купілі і зманціравалі вытворчую лінію, набылі прэс-падборшчыкі і іншую неабходную тэхніку, будуюць павеці для захоўвання сыравіны, каб, як гаворыцца, у поўным узбраенні сустрэць сёлетняе жніво.

А затым у генеральнага дырэктара прадпрыемства «Гроднааблпаліва» Віктара Нікалайчыка (якога хочацца шчыра павіншаваць з надыходзячым юбілеем) і яго калег, магчыма, з'явяцца новыя ідэі і праекты. Чаму б і не?

Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота аўтара.

Зварот у карпункт

НАДБАЎКІ ВЯРТАЦЬ НЕ ТРЭБА

Ці праўда, што цяпер, калі мужчына добраахвотна прызнае бацькоўства, маці павінна кампенсаваць дзяржаве надбаўкі да матэрыяльнай дапамогі на выхаванне дзяцей, якія атрымлівала як маці-«адзіночка»? Або тата павінен будзе «разлічыцца» з дзяржавай? — з такімі пытаннямі ў карэспандэнцкі пункт рэдакцыі па Віцебскай вобласці звярнулася чытачка Наталля Амосава з Пастаўскага раёна.

Па афіцыйны каментарый пытання карэспандэнт «Звязды» звярнуўся ў Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама. Як растлумачылі спецыялісты, выплата надбаўкі спыняецца з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб прызнанні бацькоўства, аб усынаўленні (удачарэнні), а таксама ўступлення жанчыны ў шлюб або сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі з асобай, з якой не зарэгістраваны шлюб. Сума раней выплачанай надбаўкі вяртанню не падлягае ў выпадку своечасовага інфармавання камісіі па прызначэнні дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, аб наступствы вышэй названых абставін.

У афіцыйным адказе таксама гаворыцца, што дзеці з моманту ўстанаўлення бацькоўства прыраўноўваюцца да дзяцей, якія нарадзіліся ў шлюбе. І бацькі карыстаюцца аднолькавымі правамі і нясуць аднолькавыя абавязкі ў дачыненні да сваіх дзяцей. Спагнанне сум на ўтрыманне дзяцей, у дачыненні да якіх установлена бацькоўства, ажыццяўляецца ў судовым парадку або па згодзе паміж бацькамі. Пры ўстанаўленні бацькоўства аднічэнні ў фонд сацыяльнай абароны не робяцца.

Што тычыцца памераў штомесячных надбавак, то, як адзначылі ў лісце з Камітэта, яны залежаць ад узросту дзіцяці. У прыватнасці, да дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў (з 01.02.2011 — 296870 рублёў) — у памеры 75 працэнтаў гэтай дапамогі, пакуль дзіцяці не споўніцца паўтара года, і ў памеры 40 працэнтаў на дзіця ва ўзросце ад паўтара да трох гадоў. А да дапамогі на дзяцей, якім больш за тры гады (з 01.02.2011 — 89060 рублёў) — у памеры 40 працэнтаў гэтай дапамогі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ФАНФАРЫ АДГРЫМЕЛІ...

У Баранавічах прайшоў II Міжнародны фестываль духавой музыкі «Баранавіцкія фанфары-2011»

Апошняя рэпетыцыя (Магілёўскі духавы аркестр МНС).

Фестываль праводзіцца падчас штогадовага свята «Баранавіцкая вясна». Сёлета яно супала з 140-годдзем горада, але гэты факт асабліва не паўплываў на ход урачыстасці. Усё было як і ў мінулыя гады: гучала музыка, прадэфіліравалі дзяўчаты ў строях нявест, выступілі рыцары....

Найбольшую цікавасць у жыхароў горада выклікалі шэсце духавых аркестраў, якія прадстаўлялі нашу краіну, Расію, Украіну, Літву, і пятнічны феерверк — у гэты дзень свята адкрылася.

У Лядовым палацы праходзіла IV Міжнародная ўніверсальная выстава-кірмаш, а каля кінатэатра «Кастрычнік» выставілі на продаж свае вырабы народныя майстры і прафесіяналы. Сярод апошніх была і сям'я Вялічкаў з Бабруйска. Павел і Марына прапаноўвалі сваю кераміку.

Некалькі гадоў таму я купіў у іх невялікі сувенір. Зараз мяне здзівіла, што цана на керамічныя вырабы не паднялася. Няўжо крызіс не краўнуў майстроў?

— А які сэнс падымаць цану? Сёння людзям няпроста, ды і трэба рэальна глядзець на рэчы. Неабходна прадаць, і цану дыктуе пакупнік.

— Купляюць?

— Падыходзяць, цікавяцца, выбіраюць і купляюць.

І пры мне некалькі чалавек выбралі сабе сувеніры. Сапраўды, 5-6 тысяч за невялікі керамічны выраб — зусім танна.

Тры дні працягвалася свята — горад ажываў у другой палове дня, і, нягледзячы на дачны сезон, цікавасць да фестывалю ў гараджан, асабліва моладзі, была, а гэта прыемна.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ ЖАНЧЫН

Немцы прапанавалі стварыць у Магілёве адукацыйны цэнтр па эндаскапіі ў галіне гінекалогіі.

Дэлегацыя нямецкіх медыкаў на чале з галоўным урачом Евангелічнай бальніцы ў Кёльне прафесарам Томасам Ромерам правяла адукацыйны семінар для беларускіх калегаў. На базе аддзялення аперацыйнай гінекалогіі Магілёўскай бальніцы № 1 пад кіраўніцтвам немцаў адбылося 14 аперацый, у тым ліку па лячэнні бясплоддзя.

Томас Ромер лічыць, што стварэнне ў Магілёве адукацыйнага цэнтра для гінеколагаў дазволіць распаўсюдзіць у Беларусі перадавыя нямецкія веды і тэхналогіі.

Ілона ІВАНОВА.

ВЫРАТАВАЛІ ФУРУ З МЭБЛЯЙ

Пра пажар грузавога аўтамабіля амаль у 23 гадзіны ў Браслаўскае падраздзяленне МНС паведаміла грамадзянка, якая ехала міма. Здарэнне адбылося на 11-м кіламетры аўтадарогі Браслаў — Міёры, каля вёскі Рубеж.

Праз сем хвілін на месцы выратавальнікі назіралі гарэнне кабіны грузавога аўтамабіля «Volvo FH» (цягач 2001 года выпуску з паўпрычэпам), які належаў прыватнаму транспартнаму ўнітарнаму прадпрыемству з Клайпеды (Літва). Машына ішла з Клайпеды ў Маскву з грузам мэблі. Вадзіцель на момант прыбыцця знаходзіўся побач з транспартным сродкам. У выніку самастойнага тушэння пажару ён атрымаў тэрмічныя апёкі 1-3 ступені ног, рук і твару (30 працэнтаў). Брыгадай хуткай дапамогі ён быў дастаўлены ў Браслаўскую раённую бальніцу. Праз дзве хвіліны пажар быў лакалізаваны, яшчэ праз хвіліну — ліквідаваны. Дзякуючы дзеянням выратавальнікаў груз не пацярпеў. Як мяркуецца, прычына пажару — кароткае замыканне электраправодкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 1 июля 2011 г. открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Наименование и характеристики продаваемого имущества	**Изолированное помещение культурно-просветительного и зрелищного назначения, расположенное на первом этаже кирпичного здания 1952 г. постройки, инвентарный номер № 500/D-683909, общая площадь 73,73 кв.м**
Местонахождение имущества	г. Минск, пр-т Партизанский, 109, 1н
Сведения о собственнике	ОАО «Минский автомобильный завод»
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 40 22
Начальная цена	169 575 000 белорусских рублей без НДС
Сумма задатка	16 000 000 белорусских рублей

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 7 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи по согласованию с продавцом.

Аукцион состоится **1 июля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 01.06.2011 по 29.06.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22.

Галоўны трэнер «маладзёжкі» Георгій КАНДРАЦЬЕЎ:

«Нашу каманду суддзі душыць не будуць»

Моладзевая зборная па футболе сабралася ў Мінску — на апошні этап падрыхтоўкі да чэмпіянату Еўропы, які стартуе ў чэрвені ў Даніі. Усе мы, безумоўна, памятаем яе выдатнае выступленне летась на адборачным этапе. А восеньскі матч супраць зборнай Італіі, дзе вырашаўся лёс дацкай пуцёўкі, па праве можна назваць адной з самых гучных нашых футбольных перамог. Галоўны трэнер Георгій Кандрацьеў расказаў, на што можа разлічваць наша каманда ў Даніі, як адчуваюць сябе гульцы і чаго чакаць ад супернікаў і суддзяў.

«Упэўнены, што ў паўфінал выйдзем»

Спачатку галоўны трэнер растлумачыў, чаму спыніў свой выбар менавіта на 23 гульцах, выкліканых на гэты збор:

— Я ўзяў тых, у каго веру, з кім прайшоў цяжкі шлях, трапляў у найскладанейшыя сітуацыі. Прашу мой выбар паважаць.

— Георгій Пятровіч, як будзе рыхтавацца каманда да чэмпіянату Еўропы?

— Мы сабраліся 28 мая. Бачна, што адны насыціліся футболам, іншыя — траўмаваныя, трэція — у дрэнным псіхалагічным стане. Таму зараз у хлопцаў толькі лёгкія трэніроўкі. Асноўная праца пачнецца ў Германіі, дзе мы прабудзем да 8 чэрвеня. Пасля пераязджаем у Данію. Траўмаваныя Гардзейчук і Юрчанка. Але больш за ўсё мяне расстроіла траўма Паўла Няхайчыка: у апошні гульні, як звычайна, калі арганізм стомлены і просіць адпачынку... Ён застанецца ў Мінску, будзе залечваць. Не ведаю, ці паспее да першага матчу.

— Чаму абралі Германію, і дзе каманда будзе жыць у Даніі?

— У Германіі амаль аднолькавы з Даніяй клімат. Паедзем аўтобусам, каб не было перасадак. Базу дапамог выбраць Бернд Штанге. Там ідэальнае месца для трэніровак. У Даніі мы будзем жыць адасоблена. Я ўжо ездзіў мінулы раз на чэмпіянат свету: каманда жыла ў гасцініцы, дзе жылі журналісты, бадзяліся агенты. Наш трэнерскі штаб прыняў рашэнне паехаць за горад і жыць адным.

— Задачы на чэмпіянат перад камандай пастаўленыя?

— Банальна казаць, што будзем імкнуцца перамагаць у кожным матчы. Будзем біцца, каб трапіць на Алімпійскія гульні.

— Што скажаце пра нашых супернікаў?

— Яны ўсе ўжо як родныя для мяне — столькі дыскаў прагледжана. Больш часу мы, зразумела, надаём Ісландыі, з ёй першая гульня. Ёсць дасье на кожнага гульца — дзякуй Лёшу Вергіенку, які сур'ёзна паставіўся.

— З боку супернікаў цікавасць адчуваеце?

— Напэўна, таксама вывучаюць. Дамовіліся падчас лёсавання абмяняцца дыскамі. І мы, як сумленныя, на наступны дзень свае ўсім раздалі. Ісландцы, дзякуй ім, даслалі пасля, а астатнія — не.

— Што гэты чэмпіянат значыць асабіста для вас?

— Я не аддзяляю сябе ад каманды. Для нас гэта вялікае выпрабаванне, але і вялікі шанц, якім пастараемся скарыстацца.

— Ці ўдавалася кантактаваць з трэнерамі клубаў вышэйшай лігі, дзе гуляюць вашы падапечныя?

— Гэта балючае пытанне. Калі я пачну адказваць, нажыву шмат ворагаў.

— Судзейства на чэмпіянатах Еўропы не раз было для нашых «маладзёжак» фатальным...

— Тударам хіба што дзяцей у дзіцячых садках не палохаюць. Нічога страшнага ён не зрабіў, тое выдаленне было па правілах. Суддзя ў дачыненні нашай каманды памыліўся толькі аднойчы: не прызначыў пенальці ў вароты Італіі. Нашу каманду ніхто не душыць. Я баяўся за гульні з Італіяй, але арбітры нармальна адпрацавалі. Лёша Кульбакоў растлумачыў нам асноўныя моманты, якіх трэба пазбегнуць на чэмпіянаце Еўропы. Ніхто нас там забіваць не будзе.

— Якія вашы прагнозы наконт выступлення каманды?

— Зараз у нас каманда гуляючая: 500-600 дотыкаў да мяча — гэта ўзровень топ-дружын. Дрэнная гульня на этапе кваліфікацыі была ў нас толькі адна — хатняя з Азербайджанам. Упэўнены, што ў паўфінал выйдзем.

«Галоўная парада — не прадаваць сябе ехаць»

Сваімі думкамі падзяліліся і гульцы зборнай Ягор Філіпенка (Я. Ф.) і Стас Драгун (С. Д.).

— Якія парады давалі футбалісты, якія пабывалі на чэмпіянаце Еўропы?

С.Д. — Чэмпіянаты ў нас шмат хто з «маладзёжкай» прайшоў. Галоўная парада — ехаць не прадаваць сябе, а дасягаць выніку. Любой цаной.

— Як адчуваеце сябе перад турнірам?

С.Д. — Нават паўмёртвы гулец будзе хацець паказаць на спаборніцтвах такога ўзроўню свае лепшыя якасці.

— Згодны, што камандзе па сілах прабіцца ў паўфінал?

С.Д. — Калі Пятровіч гэта казаў, я падумаў: яго словы ды Богу ў вушы. Няхай усё так і будзе.

— Хто з супернікаў для нашай каманды больш падыходзіць?

С.Д. — Датчане і ісландцы фізічна магутныя, у іх сілавы футбол. У швейцарцаў выдатны тэхнічны, хуткі футбол...

Я.Ф. — Нам Люксембург больш падыходзіць:).

С.Д. — Усе супернікі складаныя.

Я.Ф. — Трэба адштурхнуцца ад сваёй гульні. Мы павінны, зразумела, разбіраць матчы супернікаў, але паказваць трэба свой футбол, навязваць сваю гульню.

— Гульня з Італіяй — лепшая для каманды?

Я.Ф. — Заўсёды ёсць памылкі, нават з Італіяй, але гэта лепшая гульня пакуль. Праўда, мы можам яшчэ лепш.

— Чым будзеце займацца на зборы, апроч футбола?

Я.Ф. — У карты, гэта не сакрэт, любім згуляць. Ва ўсіх ёсць ноўтбукі, фільмы можна паглядзець. Ёсць хлопцы з выдатным пачуццём гумару — у камандзе нам ніколі не сумна.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Ліга чэмпіёнаў

«Барса» заваявала Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў

У чацвёрты раз у сваёй гісторыі іспанская «Барселона» выйграла фінал Лігі чэмпіёнаў. У суботу каманда атрымала «вушасты» трафей з рук Мішэля Плаціні. А «Манчэстар Юнайтэд» на справе так і не змог абвергнуць меркаванне, што «сіне-гранатавыя» сёння — наймацнейшы еўрапейскі клуб, гэтак жа як аватару «манкуніянцаў» ван дэр Сару, які праводзіў апошні матч у кар'еры, не наканавана было стаць самым узроставым пераможцам Лігі чэмпіёнаў.

На галы Педра Радрыгеса, Ліянэля Месі і Давіда Вільі «МЮ» змог адказаць толькі дакладным ударам Уэйна Руні. Гэтак жа і два гады таму, калі каманды сустракаліся ў аналагічным фінале, «Барса» здолела абыграць англічан з розніцай у два мячы. Цяпер Іспанія мае 13 Кубкаў еўрапейскіх чэмпіёнаў — на адзін больш за Італію.

Першым Кубак атрымаў Абідаль, якому капітан каманды Пуёль аддаў сваю павязку. Так каманда падтрымала футбаліста, жыццё якога яшчэ нядаўна было пад пагрозай — Абідаль пакутаваў ад пухліны печані. А ў аэрапорце Барселоны першымі з трапа самалёта спусціліся з Кубкам галоўны трэнер Хасэп Гвардыёла разам з капітанам Пуёлем. Дома каманду, якая праехала з аэрапорта на свой стадыён «Ноў Камп» у аўтобусе з адкрытым верхам, сустракала каля мільёна прыхільнікаў. Дарога заняла 2,5 гадзіны, падчас якой Кубак быў завезены ў Цэнтр сусветнага гандлю, а самі футбалісты былі ўганараваныя авацыямі на родным стадыёне. За перамогу «Барса» атрымала прэміяльныя ў 126 мільёнаў еўра, сярэбраны прызёр — 73 мільёны.

Алена КРАВЕЦ.

Минский районный исполнительный комитет *9 июня 2011 г.* **повторно проводит открытый** *аукцион* **по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Горанский с/с, д. Казельщина	623681308101000036	0,1537 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 263 446	12 000 000	1 200 000
2	Горанский с/с, д. Казельщина	623681308101000037	0,1532 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 260 422	12 000 000	1 200 000
3	Крупицкий с/с, д. Дубинки	623683903101000051	0,1613 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	660 566	19 000 000	1 900 000
4	Крупицкий с/с, д. Дубинки	623683903101000052	0,1687 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	736 906	20 000 000	2 000 000
5	Крупицкий с/с, д. Каралино	623683905601000146	0,1535 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	719 951	14 000 000	1 400 000
6	Крупицкий с/с, а/г Крупица	623683906601000498	0,1498 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	922 826	20 000 000	2 000 000
7	Крупицкий с/с, а/г Крупица	623683906601000499	0,1498 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 065 367	20 000 000	2 000 000
8	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 21	623684200601000061	0,1330 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	31 000 000	3 100 000
9	Михановичский с/с, д. Котяги, участок № 10	623684203601000243	0,1378 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	49 000 000	4 900 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **09.06.2011 г. в 10.30**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **03.06.2011 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 3–7 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 8–9 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Предложение о покупке акций ОАО «БрандкоВИН»

УСЛОВИЯ ПРЕДЛОЖЕНИЯ

1. **Покупатель** — Открытое акционерное общество «БрандкоВИН», Республика Беларусь, Витебская область, г. Новополоцк, г.п. Боровуха, ул. Армейская, 57, контактный телефон (0214) 59 79 85. УНП 391296728.

2. **Эмитент акций** — Открытое акционерное общество «БрандкоВИН», Республика Беларусь, Витебская область, г. Новополоцк, г.п. Боровуха, ул. Армейская, 57. УНП 391296728.

3. **Цель приобретения акций** — последующее аннулирование.

4. **Количество акций к приобретению** — 140 (сто сорок) штук.

5. **Цена приобретения:**

3 000 (три тысячи) белорусских рублей за одну простую обыкновенную акцию.

Цена приобретения является фиксированной для всех предложенных к приобретению акций.

6. **Срок, форма и порядок оплаты** — в белорусских рублях по безналичному расчету в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора.

7. **Адрес, по которому заключаются договора купли-продажи** — 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31а.

8. Срок предоставления предложений акционеров о продаже акций ОАО БрандкоВИН» **с 06.06.2011 г. по 29.07.2011 г.**

9. Срок приобретения акций — **с 09.06.2011 г. по 31.07.2011 г.**

УНП 391296728

НЕБЯСПЕЧНАЯ СТАТЫЧНАЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ

Узгаранне паліва адбылося, калі два жыхары Лельчыцкага раёна пералівалі бензін з металічнага вядра ў пластмасавую каністру — для запраўкі аўтамашыны «ГАЗ-66» на тэрыторыі мясцовага лесапункта. Паліва ўспыхнула і трапіла на людзей, якіх тэрмінова шпіталізавалі з апёкамі. Аднак выратаваць 36-гадовага жыхара вёскі Баравое не атрымалася. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, па папярэдніх звестках, узгаранне магло адбыцца ад іскры, якая ўзнікла ў выніку назапашвання статычнай электрычнасці на пластмасавай каністры. Прычына пажару — парушэнне тэхналагічнага працэсу пры запраўцы машыны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Суб'ектыў

«У мяне няма прэтэнзій...»

Алегу Кудрачову, які заступіўся за безбілетніка, мінчане сабралі на штраф больш за 1,5 мільёна

На мінулым тыдні гэта гісторыя ўзарвала інтэрнэт. Карыстальнікі выклалі відэа, дзе ў цэнтры горада затрымлівалі мужчыну, які заступіўся перад кантралёрам за безбілетнага студэнта. З крыкамі «Адпусціце невінаватага чалавека» некалькі дзясяткаў чалавек, пераважна жанчыны, адцягваюць міліцыянераў...

А перадгісторыя гэтай масавай патасоўкі такая. У аўтобус 38-га маршруту на адным з прыпынкаў зайшла кантралёр і пачала правяраць у пасажыраў білеты. Студэнт, за якога заступіўся мужчына, быццам бы меў нават талон, толькі прабіў яго пасля таго, як кантралёр увайшла ў салон. Жанчына запатрабавала заплаціць штраф, студэнт адмовіўся. Кантралёр паклікала міліцыянера, супрацоўніка аддзела аховы, які ехаў у тым жа аўтобусе. Ён таксама стаў патрабаваць штраф.У выніку за маладога чалавека заступалася ледзь не палова пасажыраў. Сярод іх быў і Алег Кудрачоў. На прыпынку побач з «Гандлёвым домам «На Нямізе» з аўтобуса выйшлі кантралёр, міліцыянер, студэнт і некалькі неабыякавых пасажыраў, а канфлікт набыў развіццё. Да яго падключыўся яшчэ адзін міліцыянер, участковы Маскоўскага РУУС, які ішоў па вуліцы. Алег Кудрачоў прапанаваў адпусціць студэнта, аднак... Тады мужчына параіў студэнту: «Бегаць умееш — уцякай». У выніку студэнт збег, а затрымаць вырашылі... Алега Кудрачова. Пасля апісанай вышэй патасоўкі, якую знялі на тэлефон мінакі і выклалі ў інтэрнэт, прыехаў спецназ і мужчыну адвезлі ў Цэнтральнае РУУС.

Я не збіралася распавядаць пра гэтую гісторыю ў газеце, бо спадзявалася, што з яе знойдуць дастойнае выйсце.

Увечары на сайце ГУУС Мінгарвыканкама прачытала:

— У цяперашні час па гэтым інцыдэнце праводзяцца праверачныя мерапрыемствы, апытваюцца яго ўдзельнікі і сведкі. Паводле папярэдняй ацэнкі, у дзеяннях мінчаніна, які агрэсіўна ўмяшаўся ў канфлікт, выяўлены састаў правапарушэння, але для канчатковай ацэнкі сабраныя матэрыялы будуць накіраваны ў пракуратуру і суд Цэнтральнага раёна. Разам з тым, трэба адзначыць, што супрацоўніку аддзела Дэпартамента аховы нанесеныя цялесны пашкоджанні, а таксама пашкоджана форменнае абмундзіраванне. Асобы грамадзян, якія ўдзельнічалі ў канфлікце і перашкаджалі выкананню службовых абавязкаў супрацоўнікаў міліцыі на аснове відэаздымак, што былі зроблены, зараз устанаўліваюцца. Ім будзе дадзена адпаведная прававая ацэнка.

Амаль суткі Алег Кудрачоў правёў у Цэнтральным РУУС, на яго быў складзены пратакол за непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі, а на наступны дзень адбыўся суд. Алега аштрафавалі на 700 тысяч. Так у гісторыі была пастаўлена кропка.

Першыя каментарыі, якія з'явіліся ў інтэрнэце пасля гэтай навіны: «Давайце скінемся чалавеку на штраф». Людзі пісалі: «Згодны аддаць Алегу 200 тысяч, сам у такой сітуацыі паступіў бы аналагічна». Неабходную суму ў інтэрнэце мінчане сабралі за 2 гадзіны. Да вечара набралася сума больш за 1 мільён 200 тысяч. Гадзіну грошы збіралі яшчэ і ўвечары, на месцы здарэння, побач з «Гандлёвым домам «На Нямізе» — яшчэ больш за трыста тысяч. Я крыху спазняюся: калега з інтэрнэт-партала, які і збіраў грошы, ужо перадаў поліэтыленавы пакет з купюрамі Алегу. Апошні дэманструе канверт з надпісам «Алегу 1 294 550 з Твітэра». А людзі працягваюць падыходзіць і пакідаць грошы, зусім маладыя хлопцы просяць Алега з імі сфатаграфавацца:

— Я і не ўяўляў, што мяне падтрымае столькі людзей. Я шчаслівы, што сотні чалавек не засталіся абыякавымі. Афіцыйна я беспрацоўны, займаюся продажам сістэм водазабеспячэння. Грошы пойдуць на аплату штрафу, а астатняе я патрачу на дабрачыннасць — хворым дзецям.

У судзе Алег прасіў замяніць штраф арыштам, бо не меў грошай, аднак суддзя не захацеў яго адпраўляць на суткі.

— Алег, у відэаінтэрв'ю пасля суда вы папрасілі прабачэння «ў тых, ад каго пацярпелі»...

— У мяне сапраўды няма прэтэнзій да міліцыі. Мяне ніхто не біў, толькі мезенец пры затрыманні выкруцілі. А галаву я параніў, калі падчас затрымання мы штурхаліся і я ўдарыўся аб сцяну. Калі ехалі ў РУУС, мне патэлефанавалі з адной газеты, і я сказаў, што сам вінаваты, а дзяўчына пытае: «Вас ужо апрацавалі»? Ніхто мяне не апрацоўваў. Лічу, што негатыўныя эмоцыі трэба адпускаць, не «трымацца» за іх, і прасіць прабачэння — гэта па-хрысціянску.

...Цана пытання гэтай масавай патасоўкі — 850 рублёў, кошт талончыка на праезд, з-за якога ўсё, уласна, і адбылося.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ТАКАЯ ЛЮБОЎ

Простая мова

...Крамы тады стаялі пустымі — тавараў амаль не было, ды і тыя па картках.

— І як гэта далей жыць? — невядома ў каго пытала адна з пакупніц.

Ёй унучак малы адказаў. Як сцешыў:

— Табе што... Ты хоць старая — неўзабаве памрэш, а вось мне — гараваць і гараваць яшчэ. Празорца?

ДЗІВА

Раніца. Тралейбус — поўны салон дзяцей. Яны, безумоўна ж, мілыя, вясёлыя, яны хораша, па сезоне апрануты (не думаць, колькі гэта цяпер каштуе!), яны — як тыя птушаняты, без супынку шчабечуць.

— Мне дзядуля новую гульню падарыў! — хваліцца адзін з хлапчукоў.

Ніхто з іншых не пытае чамусьці, якую ж.

— Мне мама новы веласіпед купіла!

Зноў — нуль увагі...

— А майму татку «мерса» з Германіі гоняць.

Нават ім ніхто не цікавіцца!.. Ад чаго на памяць прыходзіць фінальная фраза з анекдота: «...А ў нас у склепе вось такі во пацук жыве!» — «Ух ты!.. Пакажаш?!»

КІНО. БЕЗ НЕМЦАЎ

Сужэнцы С. серыялы не глядзяць. Цягам апошніх чатырох гадоў яны (загінайце пальцы): справілі вяселле — аддалі замуж дачку, з галавой улезшы ў даўгі; купілі маладым аднапакаёўку; прычакалі ўнука, затым і ўнучку; аддалі ім (найперш малым!) сваю трохпакаёўку, самі пераехалі ў іхнюю аднапакаёвую (што сям'ю, аднак, не з'яднала: развяліся, зяць сем судоў прайшоў, каб даказаць, што тая трохпакаёвая кватэра... яго?!).

Сужэнцы С. серыялы цяпер не глядзяць. Прынцыпова: жыццё — куды цікавейшае.

«ЧУЖОЕ»

Субота, сталіца, універсам. На ўваходзе — абменнік. Ля яго — як прыкмета часу — чарга: не сказаць, каб вялікая — чалавек мо з дзесяць, але ж стаяць даўно і, здаецца, мёртва!

Зрэшты, слова «стаяць» тут не да месца, бо адзін з мужчын хуткачэй «вісіць» — на пустым вазку для прадуктаў, другі (дзяцюк) — можна сказаць, ляжыць: стомлена прываліўся да кабінкі абменніка, заплюшчыў вочы...

Цётку нейкую бурай несла — зачапілася за яго нагу, прашыпела:

— Постали тут... Далась им эта валюта! У мяне вот нет её и не надо!

— И я её в глаза не видела, — падхапіла другая, — и даже видеть не хочу!

— Я бы тоже не хотел, — у адказ ім кінуў дзяцюк, — если б жильё не снимал — за доллары.

Але цёткі яго не чулі — яны шыбавалі далей: свае ў іх клопаты, свае і справы.

Не да «чужых».

ДОСВЕД

Праезд дарагі. Калі ехаць далёка, тую тысячу (амаль) за талон не шкада, калі блізка...

Трэцяга дня ў аўтобус заходзіла, а мужчына нейкі выходзіў. Вокам міргнуць не паспела, — у мяне... яго талон у руках.

...Раней так рабілі толькі ў Бабруйску.

КАБ ЗАПОМНІЦЬ

З ліста.

«...Незнаёмка была ў чорным і ішла насустрач. Значыць, нехта памёр? Сапраўды, — сказалі сямейнікі, — сусед па пад'ездзе. А значыць, якія б адносіны там ні былі (нават, калі ніякіх), трэба схадзіць у кватэру, пастаяць ля труны, спытаць ва ўдавы, што здарылася: не стары ж зусім чалавеча?

— Так, не стары, — згадзілася кабета, — але дужа ж ветлівы: згледзіць некага са знаёмых альбо з начальства, — здалёку шапку здымае... Вось галаву і застудзіў. За тры дні згарэў — менінгіт.

Страшная хвароба, заўчасная смерць: пашкадаваўшы чалавека і ягоных блізкіх, большасць суседзяў пайшла па дамах. Асобныя ж — вярталіся назад, да труны, каб яшчэ раз паглядзець на нябожчыка, бо ветлівых людзей цяперака мала.

І тыя сыходзяць.

ШКОЛА

У горадзе свой гастраном (ну, той, што ля дома), лічы, тое ж, што і крама ў вёсцы: да драбніц знаёмыя прылаўкі, твары прадавачак, нават пакупнікоў — часцяком сустракаюцца, гамоняць.

— Ты что так легко оделась? — пытае, прынамсі, адна жанчына ў другой.

— Так по телевизору ж передали — 20 градусов тепла ожидается!

— А ты и уши развесила!.. Што телевизор теперь, што мужик... Слушать их еще можно, а верить, — Боже упаси!

Школа...

ДОБРАЯ ПАМЯЦЬ

...Ён не сваяк, не сябар, але ж цяжка хварэў — ляжаў у бальніцы. Мы ведалі, у якой. І аднойчы, праязджаючы міма, зайшлі праведаць.

Ён рады быў — прыняў гасцінцы, пасядзеў, пагаварыў. На развітанне, праўда, зазначыў, што яму тут — яшчэ «не бяды», бяда жонцы, дома, бо адна там з малымі і, лічы, без грошай...

Прапаноўваць іх у тыя, камуністычныя часы, азначала пакрыўдзіць (ці нават абразіць), таму дзейнічаць сталі інакш: прысмакі, прадукты насілі яму, ён — аддаваў у сям'ю. Разоў колькі заязджалі і да жонкі — прывозілі (ураджайны выдаўся год!) нейкую садавіну, гародніну... Яна прымала і, здавалася, удзячнай была: запрашала на кухню, хацела частаваць, але ж мы не згаджаліся: у вітальні пакінуўшы сумкі, хуценька з'язджалі.

...Даўно гэта было. Чалавек той, дзякаваць Богу, паправіўся, дзеці яго падраслі... Нават адрас сям'я змяніла — у новае жытло пераехала.

— Тры пакоі ў нас, — хваліцца жонка, — кухня — 10 квадратаў, вітальня — 13, прасторная, не тое, што ўперад была...

— Як бабе сесці, — успамінаю і я.

Кабета насцярожваецца:

— Адкуль вы ведаеце?

— Дык была ж... Як быццам...

— Не, — катэгарычна заяўляе жанчына, — памяць у мяне дай Бог: помню, хто ў нас быў, а хто не. Вы — не былі.

... ?

СЫН ЗА БАЦЬКУ

Раніца, тралейбус. На пярэдняй пляцоўцы — амаль нікога, толькі п'яны, п'яны да гідкасці. Мажны, высокі, ён «размазаўся» на ўсё сядзенне, выцягнуў ногі, нешта чаўпе — то ціха, пад нос, то раптам раве — на ўвесь салон. Што, — не зразумець. Хіба — час ад часу — асобныя фразы. Кшталту:

— Мой сын победит!.. Вот увидите!.. Он их сделает!.. Он — чемпион! Чемпион мира!

...Спачатку крычаў, здаецца, краіны? Потым — Еўропы?

Зрэшты... Хай сабе і свету! Рэйтынг п'яніцы-бацькі, як падалося, гэта не ўздыме.

АСАННА

Ён быў...

Вось так — у мінулым часе... За два гады ўжо ж можна прывыкнуць?

Дык, значыць, ён быў...

Якім? Ну, вельмі акуратным (у адзенні, учынках, словах), вельмі разумным і добрым, інтэлігентным... І на здзіў майстравым: знаёмыя і незнаёмыя насілі, вазілі да яго радыёпрыёмнікі, электрапрасы, тэлефонныя апараты, потым — магнітафоны, тэлевізары, кампютары... Ён — рамантаваў! Усё чыста! Што, напэўна ж, не дзіва: лётчык... Да таго ж — выпрабавальнік!..

Быў час — мы досыць часта сустракаліся, не раз сядзелі за сталом, здаралася — разам той стол рыхтавалі, і ён тады, як ніхто, з дапамогай нажа, проста віртуозна чысціў яйкі!

...Ён быў!

Мы помнім, мы ўспамінаем яго часцяком: прынамсі, заўсёды, калі нешта зломіцца і трэба несці ў рамонт, калі ў небе гудзіць самалёт, само сабой — у дзень ягоных народзінаў і заўчаснай смерці.

...А найчасцей — на кухні, чысцячы яйкі.

ПЕРАЖЫТАЕ НЕ ЗАБЫТАЕ

На жыццё Пятровіч не скардзіўся: цёплая хата, сям'я, гаспадарка, неблагая пенсія, нават здароўе...

Адзінае (па сакрэце неяк прызнаўся) — «паталкаваць» ахвота: паўспамінаць сваё, перажытае — незабытае, паслухаць чужое, абмяняцца думкамі. Прычым не абы з кім, а са сваімі аднагодкамі! І не абы-дзе (на лаўцы там, ля пад'езда, ці ў краме), а спакойна, грунтоўна — па-людску...

Карацей, у шпіталь для такіх, як і сам ветэранаў, ён збіраўся з імпэтам — як некалі ў санаторый ці Дом адпачынку.

А прыехаў...

У палаце адзін з яго аднагодкаў нямоглы зусім, другі — глухі, трэці — «пацан» (афганец). З кім гаварыць?

Але ж суразмоўцы, напэўна, знайшліся б — не праз дзень дык праз тыдзень, калі б...

Першую ноч ён амаль не спаў — з непрывычкі, другую таксама — неяк душна было і шумна (глухі той хроп)... У трэцюю ж і наогул прачнуўся ў халодным поце: побач з ім... нехта лажыўся!

Думаў спрасонку, што баба яго — звар'яцела, маладосць рашыла ўспомніць. Прыгледзеўся, абмацаў — не, не жонка: гэткі ж, як ён, стары... З суседняй палаты... Па сваёй патрэбе хадзіў (у другі канец калідора), а па дарозе назад дзверы пераблытаў...

Раніцой ад душы пасмяяліся.

А ноччу той дзед ізноў недагледзеў, ізноў зарана звярнуў і Пятровічу сеў на хворыя ногі.

...З санаторыяў, з дамоў адпачынку ён ніводнага разу не з'язджаў дачасна. Са шпіталя — было: набаяўся, каб горай не стала.

ВЫБАР

Сталіца, вечар, паўпустыя вагоны метро...

Зрэшты, з гэтых дваіх не звёў бы вачэй і ў поўных, бо дзяўчынка — ну, выліты анёлак: мілая, бялявая, кучаравая, у пышнай блакітнай сукеначцы, у белых гольфіках, туфлях... Бо матуля (ці ўсё ж бабуля?) — поўная ёй супрацьлегласць.

І, галоўнае, не старая зусім жанчына! Ёй бы — модную стрыжачку... Лёгкую «хімію», хоць мінімальны макіяж. Ёй бы — нешта з адзення: не шэрае, не да пят і новы абутак...

Мне, нам, «спадарожнікам», мусіць, лёгка так разважаць. А ёй — заплаціць: 20 (ці колькі ж цяпер?) тысяч за стрыжку, 20 за манікюр, 30 — за «хімію» (не кажучы ўжо пра адзенне, жытло, харчаванне), значыць, у чымсьці адмовіць дзіцяці.

Яно, дзіця, што відавочна, застанецца прыгожым — і ў просценькай кофтачцы, джынсах.

Але ж анёлам ужо не будзе?

ПА ШАПЦЫ

Амаль да мая (пісала колісь прыяцелька) езджу на сваім веласіпедзе ў футравай шапцы, баюся хваробы якой падчапіць. А вяскоўцы яны ж гэта бачаць: толькі нямы не сказаў: «Здымай ужо шапку!».

Зняла, дакладней — памяняла на лёгкую. Зноў жа заўважылі, сказалі: «Значыць, лета будзе: Соня шапку зняла».

ІНШЫ КЛІМАТ

Ларыса Ціханаўна (светлай памяці!) і ў 70 прыгожай была, а ўжо ў 17... Хлопцы, казала, «аж паміралі»: і свае, і чужыя...

З гэтых, апошніх (нямецкі гарнізон у мястэчку стаяў) — найбольш улягаў адзін, інтэлігентны такі, Фрыцам звалі: танцаваць не запрашаў, дадому падводзіў, расказваў пра сваю Нямеччыну, пра бацькоў, на скрыпцы іграў пад вокнамі, у каханні прызнаваўся (у школе ў яе пяцёрка па нямецкай была — яна ўсё разумела)...

І ён разумеў, як здаецца...

Неяк дзяўчына адзенне мыць узялася — на дварэ ля студні паставіла зэдлік, на яго — начоўкі. І белае нават развесіла ўжо, а тут — скуль не вазьміся — Фрыц...

Яна не пачула, як ён падышоў: ведама — за працай, сагнуўшыся. А галаву падняла і ледзь не самлела: ён ля яравок з бялізнай стаіць, як на здзіўнае дзіўнае глядзіць на яе... панталончыкі.

Ад сораму як скрозь зямлю не правалілася: лёцьма зрываць, лёцьма хаваць...

Ён — за рукі схапіў, абняў, прытуліў да сябе, ціха сказаў: «Прашу, калі ласка, выходзь за мяне... Аніколі не будзеш так мыць... І такога насіць...».

«А як жа яшчэ можна? — здзівілася яна, паглядзеўшы на свае начоўкі. — І што насіць, калі не вось гэта?»...

Над апошнім пытаннем (і, вядома, міжволі) яна думала ці не ўсё жыццё, бо... насіла — тое, што тут насілі (і дагэтуль носяць!) амаль ўсе. Бо (на шчасце!) не любіла таго Фрыца і замуж за яго не пайшла.

...Во, колькі ўспамінаў ад кароткага аповеда пра капрызнага ўнука: знаёмая бабуля, каб загнаць яго ў пасцель, настрашыла навальніцай. Той сапраўды спужаўся, нырнуў пад коўдру і ёй, напаўголай, загадаў: «Бабуска, снимай свае сорцики и скорей лозись»...

ТАКАЯ ЛЮБОЎ

...Чым даўжэй жывеш, тым болей магіл. І, само сабой, могілак: перад Радуніцай, што б там ні стала, трэба з'ездзіць на ўсе — прыбрацца. А калі застанецца час, яшчэ і пахадзіць — пашукаць знаёмыя прозвішчы, паўзірацца ў даты жыцця і твары на медальёнах, здалёку пачуць:

— Глянь во — гэта ж Еўдакія... Паміж двух мужоў. Першага яе, законнага, у партызанах параніла, там і памёр... Перад смерцю друга свайго папрасіў, каб памог удаве дзяцей на ногі паставіць. Ну, той, адваяваўшыся, да яе і прыехаў — на трое малых. Вёска ў гвалт — столькі дзевак за вайну нарасло, столькі маладзіц... А ён — каб яшчэ пакалечаны які, а то ж не: любую бяры, — з падскокамі пойдзе... Дык упёрся ж: «Я слова нябожчыку даў...». Так і падняў ягоных дзяцей.

— А сваіх хіба не прыжыў?

— Не... У Еўдакіі з першым яе, з нябожчыкам, такая любоў, казалі, была, што апроч яго — аніхто і не даткнуўся!

...Такая любоў!

І такая дружба.

Была...

СТЫМУЛ

Актуальны анекдот — адзін з каўказцаў машыну прыдбаў. «Якая марка, мадэль, год выпуску?» — сталі пытаць калегі. «Якога колеру?» — каляжанкі. «Бэзавага», — з форсам адказаў мужчына. І нават падвёў да акна. Жанчыны глядзяць туды, — нічога не разумеюць: машына стаіць, адна, але белая.

— А бэз, як быццам, белым не бывае, — парыруе каўказец.

Бывае!.. І ў Батанічным цяпер цвіце — белым, ружовым, светла-шэрым, жоўтым, фіялетавым, вішнёвым...

І не надыхацца ім! І не налюбавацца!

Бо новай вясны — чакаць і чакаць.

Валянціна ДОЎНАР.

31 мая — Міжнародны дзень адмовы ад курэння

АХВЯРАМІ ПАСІЎНАГА КУРЭННЯ ЛІЧАЦЬ СЯБЕ 40 ПРАЦЭНТАЎ БЕЛАРУСАЎ

У пачатку мінулага стагоддзя рак лёгкага быў надзвычай рэдкай хваробай, аднак нарастанне захваральнасці ім было такім інтэнсіўным і драматычным, што рак лёгкага хутка «захрысціліў» эпідэміяй XX стагоддзя.

Адной з важнейшых прычын прагрэсіравання рака лёгкага медыкі лічаць істотнае павелічэнне ў грамадстве курцоў. І менавіта таму анколагі не вельмі любяць лячыць гэта захворванне — кажуць, што часцей за ўсё віна за гэтую хваробу цалкам кладзецца на плечы чалавека, які не змог «завязаць» са сваёй гібельнай звычкай. Няўмольная статыстыка сведчыць, што 98 працэнтаў захвораў раку гартані, 96 працэнтаў захвораў раку лёгкага і 75 працэнтаў захвораў хранічнага бранхіту і эмфізэмы лёгкіх былі актыўнымі курцамі.

У Беларусі, нягледзячы на стабілізацыю паказчыкаў курэння сярод дарослых, павялічваецца доля тых, хто спрабаваў курыць, сярод дзяцей і падлеткаў. Так, сярод вучняў пачатковай школы доля тых, хто спрабаваў курыць, узрасла за тры апошнія гады на 3,6 працэнта, а сярод вучняў 5—9 класаў прырост склаў 8,7 працэнта. Пра гэта сведчаць звесткі сацыялагічнага даследавання. Устаноўлены таксама дастаткова высокі ўзровень распаўсюджанасці сярод насельніцтва краіны пасіўнага курэння. Больш за палову апытаных паведамілі, што ім даводзіцца знаходзіцца побач з курцамі ў розных месцах: дома, у гасцях, на працы і гэтак далей, тым самым выступаючы ў ролі пасіўнага курца. Найбольш часта сутыкацца з пасіўным курэннем даводзіцца на прыпынках грамадскага транспарту — пра гэта паведамілі 40 працэнтаў рэспандэнтаў, на працы і вучобе з курцамі сутыкаюцца 39,4 працэнта апытаных, а ў гасцях — 32,2 працэнта.

Тытунь анколагі называюць канцэрагенам з больш чым 40 розных ядаў: у яго ўваходзяць нікацін, вугальныя смолы, вокіс вугляроду, цыянід, фурфурол, аміяк, сінільная кіслата і іншыя небяспечныя рэчывы. Пасля пранікнення цыгарэтнага дыму ў лёгкія нікацін трапляе ў мозг ужо праз сем секунд. Вугальныя смолы ў тытуні з'яўляюцца галоўнай прычынай развіцця раку ў курцоў: яны ўздзейнічаюць на слізістую абалонку рота, дзясны, гартань, лёгкія, страўнік і мачавы пузыр. А працяглае штодзённае раздражненне слізістай абалонкі бронхаў тытунёвым дзёгцем прыводзіць да перараджэння эпітэліяльных клетак ... Асаблівую небяспеку ўяўляе спалучэнне курэння і працы на шкоднай вытворчасці: так, курэнне ва ўмовах павышанага ўтрымання азбесту ў паветры, павялічвае рызыку захварэць на рак лёгкага ў 80-90 раз! А пасіўнае курэнне пры кантакце з курцамі на працы павышае рызыку развіцця рака лёгкага на 17 працэнтаў! Лічыцца, што для развіцця раку лёгкага патрэбны перыяд каля 20 гадоў. А да 60 гадоў у двух працэнтаў курцоў ужо гарантавана можна знайсці злаякасныя пухліны ў лёгкіх.

Дарэчы, нашы суседзі падлічылі, што расійскі курыльшчык, які высмальвае адзін пачак цыгарэт вышэйшага гатунку штодня, выдаткуе на цыгарэты каля 10 тысяч расійскіх рублёў у год. Гэта азначае, што за 10 гадоў ён можа «выкурыць» невялікую кватэру.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«СТРАЛЯЛЬНАЯ РУЧКА» КАНФІСКАВАНА

ў непрацуючага жыхара вёскі Доўск Рагачоўскага раёна. Прыстасаванне для адстрэлу 15-міліметровых сігнальных патронаў выраблена самаробным спосабам з выкарыстаннем прамысловага металаапрацоўчага абсталявання і з'яўляецца гладкаствольнай агнястрэльнай зброяй калібра 5.6 мм, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. 56-гадовы грамадзянін на верандзе дома таксама захоўваў цаўё ад стрэльбы мадэлі «ТОЗ-63», ствольную скрынку ад стрэльбы вытворчасці Бельгіі і іншыя небяспечныя прыстасаванні, якія канфіскаваны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Віншуем!

СЕЯЦЬ РАЗУМНАЕ, ДОБРАЕ, ВЕЧНАЕ...

З вышыні цяперашніх дзён падаецца дзіўным — у трагічным, жудасным 1941-м таксама была вясна, таксама была сяўба: 27 мая выйшаў першы нумар Астравецкай раённай газеты.

— За гэту, канкрэтную дату нараджэння землякі шчыра ўдзячны прафесару Адаму Восіпавічу Мальдзісю. Працуючы ў бібліятэках Масквы, ён адшукаў сем самых першых нумароў раёнкі, — гаворыць сённяшні **рэдактар «Астравецкай праўды» Ніна Аляксееўна РЫБІК**. — Іх, на вялікі жаль, няма ў рэдакцыі. Але ж мы цяпер ведаем, што газета першапачаткова называлася «Большевистский организатор» і была хутчэй інфармацыйным лістком, потым — «Сталинской правдой».

— Рускамоўнай — трэба разумець?.. Цяпер у яе ўжо іншае імя, іншая — родная — мова. Не было жадання паддацца «модзе», як гэта зрабілі многія выданні, і стаць дзвюхмоўнай, а па сутнасці — вярнуцца да таго, з чаго пачыналі?

— Не, мы прынцыпова на гэта не ішлі і не пойдзем, бо, калі газета цікавая, яе будуць чытаць, яе будуць паважаць, а падпісчыкі — захоўваць ёй вернасць яшчэ і таму, што сама яна верная — сваёй мове, сваёй Айчыне... Гэта, дарэчы, не галаслоўнае сведчанне: мы праводзілі адмысловае анкетаванне. Не дадуць мне схлусіць і лічбы: тыраж нашага выдання — 5700 экзэмпляраў на 24 тысячы насельніцтва. Значыць, мова не перашкаджае газеце быць папулярнай, быць паважанай. І, дарэчы, самыя чытабельныя, самыя запатрабаваныя матэрыялы ў нас — гэта матэрыялы, прысвечаныя гісторыі роднага краю, нашай мове, нашай культурнай спадчыне. Менавіта за іх «Астравецкая праўда» не так даўно атрымала «Залатую ліцеру»... Тым жа, хто часам скардзіўся (ды і скардзіцца), што па-беларуску чытаць цяжкавата, мы казалі і будзем казаць, што пра гэта, нарадзіўшыся, жывучы ў Беларусі, соромна і заікацца.

— Ніна Аляксееўна, «раёнка» не можа не пісаць пра сваё мінулае... І пра будучае — пра сваю Астравецкую новабудоўлю.

— Так, тэма яе, можна сказаць, не сходзіць са старонак, яна блізкая ў тым ліку і маёй сям'і, сям'і перасяленцаў... Але ж, апёкшыся на малацэ, на маю думку, не трэба да скону дзьмуць на ваду. Раён наш сельскагаспадарчы, цікавую высокаплатную працу знайсці тут цяжка. А па цяперашнім часе — і трэба, і хочацца. Таму з будаўніцтвам атамнай станцыі звязаны надзеі многіх — надзеі на развіццё, на стварэнне новых працоўных месцаў, на паляпшэнне дабрабыту.

— Добрыя раённыя газеты, здаецца, заўсёды выпучаліся сваімі артыкуламі на тэмы маралі, імкнуліся сеяць разумнае, добрае, вечнае.

— Згодна. І ў нас цяпер склаўся калектыў, які ўмее гаварыць і пісаць на гэтыя вельмі далікатныя тэмы...

— Склаўся, трэба разумець, не без вас — сябры Саюзаў пісьменнікаў і журналістаў, аўтаркі дзвюх кніжак і ўладальніцы «Залатога пяра»?

— Я бы не перабольшвала сваіх заслуг. На розныя тэмы, у тым ліку і маралі, добра пішуць Ганна Чакур, Таіса Сямёнава (яна, дарэчы, пераможца звяздоўскага конкурсу на лепшае апавяданне). Па іх слядах ідуць маладыя супрацоўніцы Алена Ярашэвіч, Марына Мацкевіч, Вольга Шоўкун...

Трэба сказаць і пра вельмі моцны касцяк няштатных аўтараў. Гэта пераважна настаўнікі, былыя настаўнікі. Кожны з іх мае сваю любімую тэму. Іаланта Валуевіч, напрыклад, апантаны краязнаўца: яна, можна сказаць, апела свой Спондаўскі край,сваіх выбітных землякоў. Вельмі таленавітыя людзі Людміла Іванаўна Кухарэвіч (яна піша вершы і нават песні), Марыя Пешка, Ніна Міралькова... Яна ў нашай мове такія словы знаходзіць, што проста заслухаешся! Паэтка, хоць і піша ў прозе. Алена Гануліч таксама піша па-беларуску, і вельмі глыбока, вельмі душэўна.

— Ніна Аляксееўна, ваша раённая газета, зноў жа ў адрозненне ад іншых (ці многіх), не адмовілася ад літаратурных старонак. З іх дапамогай вы рыхтуеце сабе кадры, змену?

— Можна сказаць і так, бо разумеем, колькі важна пачаткоўцу ўбачыць свой твор надрукаваным. Пры газеце мы стварылі літаб'яднанне «Астравецкай зямлі галасы» — штомесяц збіраемся, штомесяц стараемся (хоць і не заўсёды гэта атрымліваецца) друкаваць творы. Акрамя таго, мы гадуем свае «Парасткі» — як можам, падтрымліваем творчасць падлеткаў, дзяцей.

— На якой жа мове пішуць яны?

— І на рускай, і на беларускай. Родную ў нас, дзякаваць Богу, шануюць. Тут, дарэчы, шмат падпісчыкаў і ў «Звязды», якую на Астравеччыне любяць за шчырасць, за беларускасць, за адданасць сваёй Бацькаўшчыне.

— Дзякуй на добрым слове! З 70-годдзем! Новых поспехаў, вялікіх тыражоў — і вам, як лепшай журналістцы, і вашай «Астравецкай праўдзе», як лепшай газеце Гродзенскай вобласці.

— Дзякуй!

Валянціна ДОЎНАР.

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 21 (683) 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дом у Бягомлі, усе камунікацыі, г/п, лазня, гараж. Тэрмінова, цана дагаворная.
Тэл. 8 029 959 08 67.

При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны представить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.
Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.
При погашении облигации владельцу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигаций, а также процентный доход за последний период начисления.

7.5.10. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций
Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую двум рабочим дням дате начала погашения облигаций, указанной в пункте 7.5.6 настоящей Краткой информации (по состоянию на 04.06.2012).

7.5.11. Условия и порядок приобретения облигаций Банком до даты начала их погашения
В период обращения облигаций Банк может осуществлять выкуп облигаций у любого их владельца в следующие даты: 12.09.2011, 12.12.2011, 12.03.2012. Выкуп облигаций осуществляется у их владельцев по текущей стоимости на дату выкупа:
- на внебиржевом рынке на основании договора купли-продажи, заключенного между владельцем облигации и Банком;
- на биржевом рынке в соответствии с регламентом Биржи.
Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:
- не позднее четырех рабочих дней до даты выкупа предоставить в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
наименование владельца облигаций;
наименование ценной бумаги;
количество облигаций, предложенных для продажи;
банковские реквизиты счета для перечисления денежных средств за проданные облигации (в случае если выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке);
согласие с условиями приобретения облигаций Банком, которые изложены в настоящей Краткой информации;
юридический адрес (место нахождения) и контактные телефоны владельца;
подпись уполномоченного лица и печать владельца – юридического лица.
- при выкупе облигаций на внебиржевом рынке:
обеспечить в порядке, определенным соответствующим договором купли-продажи, перевод указанных в заявлении облигаций со счета «депо» владельца – юридического лица на счет «депо» Банка;
при необходимости предоставить в Банк карточку с образцами подписей, заверенную в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
- при выкупе облигаций на биржевом рынке:
не позднее дня выкупа перевести в соответствии с законодательством Республики Беларусь указанные в заявлении облигации на соответствующий раздел своего счета «депо» для участия в торгах на Бирже.
В случае несоблюдения владельцем облигаций сроков предоставления заявления о выкупе и (или) перевода указанных в заявлении облигаций – выкуп облигаций не осуществляется.
Банк имеет право осуществлять в соответствии с законодательством Республики Беларусь:
- продажу приобретенных облигаций Банка;
- иные действия с приобретенными облигациями Банка.

7.5.12 Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
В случае запрета выпуска облигаций Банк в месячный срок с момента принятия такого решения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь возвращает владельцу облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций с уплатой процентов за пользование денежными средствами по ставке процентного дохода, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 3 (Три) процентных пункта за текущий период начисления дохода, в котором принято решение о запрете выпуска облигаций.

7.6. Сведения о проведении открытой продажи облигаций девяносто четвертого выпуска

7.6.1. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и вид облигаций
Форма выпуска облигаций – бездокументарные.
Объем эмиссии облигаций составляет 50 000 000 000 (Пятьдесят миллиардов) белорусских рублей.
К открытой продаже предлагаются 50 000 (Пятьдесят тысяч) штук процентных облигаций.
Серия ОБ94, номера 000001 – 050000.
Вид облигаций – именные, процентные, неконвертируемые.

7.6.2. Номинальная стоимость облигации
Номинальная стоимость облигации – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

7.6.3. Период проведения открытой продажи облигаций
Размещение облигаций осуществляется с 06.06.2011 по 05.11.2011 включительно, если иной срок не будет определен Наблюдательным советом Банка. Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

7.6.4. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций девяносто четвертого выпуска.
Первичное размещение облигаций осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени до момента полной реализации всего объема эмиссии облигаций.
Владельцами облигаций могут быть юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в безналичном порядке с текущих (расчетных) счетов на счет Банка, указанный в договоре.
В случае размещения облигаций девяносто четвертого выпуска не в полном объеме, Банк вправе досрочно погасить неразмещенную часть выпуска облигаций до даты окончания срока обращения данного выпуска в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату совершения операции и рассчитывается по формуле:

С = Н + Дн,

где:
С – текущая стоимость облигации;
Н – номинальная стоимость облигации;
Дн – накопленный процентный доход.
В день начала открытой продажи облигаций текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода, рассчитываемую по следующей формуле:

Дн = (Н*П1*Т1 + Н*П2*Т2 + …. + Н*Пп*Тп) / (365(366)*100),

где:
Дн – накопленный процентный доход;
Н – номинальная стоимость облигации;
П1, П2, Пп – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенной на 3,5 (Три целых пять десятых) процентных пункта;
Т1, Т2, Тп – количество дней соответствующей части периода начисления процентного дохода, в пределах которой ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма Т1 + Т2 +…+ Тп должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления дохода.
Расчет осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году (365 или 366 в високосном году).

7.6.5. Срок и порядок обращения облигаций
Срок обращения облигаций – 183 календарных дня с 06.06.2011 по 06.12.2011. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.
Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется юридическими лицами на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа).
Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за два рабочих дня:
- до даты выплаты процентного дохода за каждый период начисления дохода в течение всего срока обращения облигаций;
- до даты погашения облигаций.

7.6.6. Дата начала погашения облигаций – 06.12.2011.

7.6.7. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода
Выплата дохода по облигациям производится в виде процентного дохода 1 раз в 3 месяца за истекший период начисления дохода владельцам облигаций, которые указаны в реестре облигаций на дату, предшествующую двум рабочим дням дате выплаты процентного дохода за соответствующий период начисления дохода, а также владельцам облигаций, которые приобрели облигации в период первичного размещения согласно соответствующим договорам после указанного срока формирования реестра до даты выплаты процентного дохода.
Процентный доход выплачивается путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода на счет владельца облигации в белорусских рублях в дату окончания соответствующего периода начисления процентного дохода:

Порядковый номер периода начисления дохода	Начало периода	Конец периода, дата выплаты дохода	Продолжительность периода (дней)
1	07.06.2011	06.09.2011	92
2	07.09.2011	06.12.2011	91
ИТОГО:	х	х	183

В случае, если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящей Краткой информации понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты включительно. День начала размещения облигаций (06.06.2011) и день выплаты дохода за первый период начисления дохода считаются одним днем.
Процентный доход по процентным облигациям за последующие периоды начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (дату погашения). День выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода и день выплаты дохода за текущий период начисления дохода (дата погашения) считаются одним днем.
Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.
Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода, определенный в соответствии с настоящей Краткой информацией, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 3,5 (Три целых пять десятых) процентных пункта.
Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

Д = (Н*П1*Т1 + Н*П2*Т2 + …. + Н*Пп*Тп) / (365(366)*100),

где:
Д – процентный доход по процентным облигациям, выплачиваемый периодически в течение срока их обращения;
Н – номинальная стоимость облигации;
П1, П2, Пп – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенной на 3,5 (Три целых пять десятых) процентных пункта;
Т1, Т2, Тп – количество дней соответствующей части периода начисления процентного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма Т1 + Т2 +…+ Тп должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления дохода.
Расчет процентного дохода осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году (365 или 366 в високосном году).
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны представить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.
Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.
При погашении облигации владельцу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигаций, а также процентный доход за последний период начисления.

7.6.10. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций
Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую двум рабочим дням дате начала погашения облигаций, указанной в пункте 7.6.6 настоящей Краткой информации (по состоянию на 02.12.2011).

7.6.11. Условия и порядок приобретения облигаций Банком до даты начала их погашения
В период обращения облигаций приобретение их Банком до даты начала погашения не осуществляется.

7.6.12. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
В случае запрета выпуска облигаций Банк в месячный срок с момента принятия такого решения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь возвращает владельцу облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций с уплатой процентов за пользование денежными средствами по ставке процентного дохода, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 3,5 (Три целых пять десятых) процентных пункта за текущий период начисления дохода, в котором принято решение о запрете выпуска облигаций.

8. Дата и номер государственной регистрации облигаций (заполняется Департаментом по ценным бумагам)
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 23 мая 2011 года.
Регистрационный номер:
Девяносто третьего выпуска 5-200-02-1114;
Девяносто четвертого выпуска: 5-200-02-1115.

9. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)
С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.

Адреса филиалов Банка и телефоны, по которым можно получить справку о продаже облигаций:
г. Брест, ул. Воровского, 11, тел. (8-0162) 27-06-61, 27-06-01,
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел. (8-0212) 35-00-21, 37-23-14,
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел. (8-0232) 79-26-89, 79-24-46,
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-25-87,
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 29-37-50,
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-91,
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 229-65-35,
г. Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-57-11.

Заместитель
Председателя Правления
ОАО «Белагропромбанк» **С.П. Чугай**

Главный бухгалтер
ОАО «Белагропромбанк» **М.А. Шаповалова**

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

Як я вучыла валенню 80-гадовую паляшучку

ХОБІ, ЯКОЕ ЯДНАЕ

— А што гэта яна робіць? — раптам узнялася бабуля са свайго месца і звярнулася з пытаннем да жанчыны, што сядзела насупраць мяне.

— Не ведаю, — адказала тая. Я крыху пачакала, бабуля пільна сачыла за кожным маім рухам.

— Валяю, — адказала я. Бабуля не адразу пачула-зразумела, і мне давялося гучна паўтарыць некалькі разоў: — Ва—ля—ю.

Валеннем я занялася адносна нядаўна. І яшчэ не надта ўпэўнена адчуваю сябе ў гэтым рукадзеллі. Але сёе-тое зваліць магу: пацеркі, завушніцы, немудрагелістую брошку або бранзалет. Пытанняў, якія падарункі дарыць сяброўкам, цяпер у мяне не ўзнікаюць: безумоўна, нешта самаробнае! Толькі вось часу на валенне не заўжды хапае, таму здараецца, што я дазваляю сабе валіць у грамадскіх месцах.

Бабулю я сустрэла ў цягніку Віцебск — Брэст. Ехала да Мінска, у маім распараджэнні было добрых пяць гадзін — не магла ж я дапусціць, каб змарнавалася столькі часу! За пяць гадзін можна звалiць шыкоўныя каралі! Шчыра прызнацца, я ўпершыню ехала цягніком брэсцкага кірунку. Але надта ўжо спадзявалася, што сустрэну каго-небудзь з беларускага Палесся. Ніколі не бачыла палешукоў... І тут гэтая бабуля! Смуглатварая, з вострым, як у высакароднай арыстакраткі, падбароддзем і доўгімі прыгожымі працавітымі рукамі ў пярсцёнках. Яна доўга сачыла за тым, як я выцягваю з празрыстых пакецікаў каляровую воўну, а потым ледзь бачнай іголачкай пераўтвараю гэты аморфны мяккі матэрыял у кругленькія роўненькія шарыкі. Нарэшце бабуля асмелілася падысці і неяк так наіўна, амаль падзіцячы, спытаць, што я раблю.

Я вельмі люблю размаўляць з незнаёмымі бабулямі. Звычайна яны распавядаюць нешта неверагодна цікавае: як Сталін выслаў бацьку ў Сібір на 10 гадоў, і бацька выжыў толькі дзякуючы таму, што быў краўцом — неабходная прафесія; якая птушка як называецца; як пяклі хлеб на рошчыне, і што такі хлеб значна больш карысны за дражджавы; а дражджавы хлеб прыдумаў Гітлер, каб сапсаваць здароўе рускім... Але самае цікавае нават не расповеды, а гаворка! Звычайна бабулі размаўляюць на трасянцы — дамінуе беларускае вымаўленне і беларускія словы з нязначнай колькасцю рускай лексікі. Але які ж гэта цікавы сінтэз беларускай і рускай моў! Бабуля Улляна з Палесся, якая ехала са мной, вядома, размаўляла не проста на трасянцы, а па-паляшуцку. «Доедымо, бутэ» — гаварыла бабуля, і прайшло недзе хвілін трыццаць, пакуль я прывыкла да гэтай гаворкі, і маё вуха стала свабодна яе ўспрымаць. Частым словам у бабулі Улляны было загадкавае «сянно»: «Сянно ён робіць так, каб людзям было горш», — разважае бабуля. І толькі калі яна некалькі разоў паўтарыла гэтае слова ў розных сказах, да мяне дайшло, што гэта значыць «усё адно». Такія вось мікраадкрыцці больш за ўсё прывабліваюць мяне ў размовах з незнаёмымі бабулямі. Так і карцела дастаць з торбы дыктафон ды запісаць для гісторыі гаворку бабулі Ульляны. Але пабаялася спалохаць яе, таму запамінала з усяе сілы, як магла. Сваю бабулю я ўжо даўно пішу на дыктафон. Мая бабуля не палохаецца невялічкага чорненькага апарата. Яна не дужа разбіраецца ў тэхніцы, думае, што гэта мабільны тэлефон.

Але вярнуся да валення. Вось дзіўна, што менавіта маё хобі звяло мяне з такім цікавым чалавекам! І ўжо было мне гонару, што 80-гадовай бабулі было чаму ў мяне павучыцца! Зрэшты, я вельмі здзівілася, што яна не ведала пра валенне наогул. І толькі калі я сказала, што валёнкі таксама валяць, толькі не іголачкай (па-сухому), а рукамі і цёплай мыльнай вадой (па-мокраму), бабуля Ульляна зразумела, што гэта за рукадзелле такое. Мая бабуля распавядала, што ў нашай вёсцы Чаропкі жыў дзед Карп, ён адзін на ўсю вялікую ваколіцу валіў валёнкі. З розных далёкіх вёсак прыязджалі да дзеда Карпа за валёнкамі. І праўда, раней валеннем займаліся выключна мужчыны, бо гэта цяжкая фізічная праца. Але сёння валенне вельмі папулярны від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, і менавіта сярод дзяўчат. Маладыя субтыльныя дзяўчаткі ва ўсю валяць і валёнкі, і торбы, і рукавіцы, і шалікі. Між іншым, сумяшчаюць прыемнае з карысным: акрамя прыгожых аксесуараў, ствараюць сабе яшчэ і прыгожую фігуру.

Ганна ШАПАШНІКАВА, куратар майстэрні «Ваўняная шафа» ў Мінску, распавядае вось што:

— Сярод беларускіх аматараў рукадзелля валенне пачало станавіцца папулярным гады чатыры таму. Але тады яшчэ не было матэрыялаў і майстар-класаў. Сёння гэта ўсё ёсць у свабодным доступе, і мы назіраем сапраўдны бум валення. Гэтаму ёсць некалькі тлумачэнняў. Па-першае, гэта новы від рукадзелля для беларусаў, новы матэрыял, да якога яшчэ не паспелі прывыкнуць і які, да таго ж, даволі танна каштуе. Па сутнасці, як вязальныя ніткі. Воўна вельмі прыемны матэрыял як тактыльна, так і эстэтычна. Вырабы з лямцу вельмі мяккія, здаецца, што яны дыхаюць. Гэта вельмі папулярны матэрыял сярод сучасных мастакоў, таму што за кошт колеру і фактуры ён дазваляе ствараць вельмі цікавыя эксперыменты. Валяючы, чалавек можа вельмі цікава праявіць і сябе, і матэрыял. Але самае галоўнае — з лямцу можна зрабіць усё што заўгодна. Воблака, камень, дождж.

Але вярнуся да валення. Вось дзіўна, што менавіта маё хобі звяло мяне з такім цікавым чалавекам! І ўжо было мне гонару, што 80-гадовай бабулі было чаму ў мяне павучыцца! Зрэшты, я вельмі здзівілася, што яна не ведала пра валенне наогул. І толькі калі я сказала, што валёнкі таксама валяць, толькі не іголачкай (па-сухому), а рукамі і цёплай мыльнай вадой (па-мокраму), бабуля Ульляна зразумела, што гэта за рукадзелле такое. Мая бабуля распавядала, што ў нашай вёсцы Чаропкі жыў дзед Карп, ён адзін на ўсю вялікую ваколіцу валіў валёнкі. З розных далёкіх вёсак прыязджалі да дзеда Карпа за валёнкамі. І праўда, раней валеннем займаліся выключна мужчыны, бо гэта цяжкая фізічная праца. Але сёння валенне вельмі папулярны від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, і менавіта сярод дзяўчат. Маладыя субтыльныя дзяўчаткі ва ўсю валяць і валёнкі, і торбы, і рукавіцы, і шалікі. Між іншым, сумяшчаюць прыемнае з карысным: акрамя прыгожых аксесуараў, ствараюць сабе яшчэ і прыгожую фігуру.

ЦУД НА ДАЛОНІ

Каб не быць галаслоўнай, я вырашыла паказаць чытачам «Звязды», як зрабіць з лямцу невялічкую кветачку, якая потым можа быць як інтэр'ерным аксесуарам, так і дапаўненнем да жаночага строю — у якасці экзатычнай брошкі. Паспрабуйце, і вы зможаце адчуць старадаўняе майстэрства, якому больш за 6 тысячагоддзяў, адчуць фізічную сілу ў руках і неўтаймоўную фантазію!

Валіць будзем па-мокраму, а таму для гэтага нам неабходна: поліэтылен з пухіркамі (у які часта пакуюць новую тэхніку), тоненькая плёнка (лепш — з-пад пакета для смецця), ільняны ручнік, воўна і шаўковая пража (прадаюцца ў спецыялізаваных крамах для рукадзелля), мыльная сумесь (дзіцячае мыла альбо любое мыла расліннага паходжання з нейтральным пахам надраць на буйную тарку, заліць кіпенем, размяшаць: атрымаецца аднародная мыльная маса, якой хопіць не на адзін выраб), палівачка, у якасці якой можа служыць звычайная пластмасавая бутэлька з прадзіраўленай накрыўкай, гарачая вада.

1 Перш-наперш раскладваем кветачку (гл. фота). Раскладка — вельмі важны этап у валенні. Тут галоўнае не спяшацца, зрабіць усё ахайна. Адрываем невялічкія кавалачкі ад мерыносавай воўны і, скручваючы на канцах, фарміруем пялёсткі. Наверх, такім жа чынам скручваючы канцы, кладзём кавалачкі шаўковай пражы, якая пры валенні дасць цікавую фактуру. Шоўк зверху накрываем вельмі тонкім слоем воўны.

2 Складаем пялёсткі ў кветку так, каб канцы пялёсткаў накладваліся адзін на адзін. Гэта створыць трывалую сярэдзінку.

3 Акуратна пераварочваем кветку і ззаду робім зялёныя лісточкі. Кавалачак воўны складваем напалам, скручваем з аднаго боку і накладваем на заднюю частку пялёстка. Лісточкі робім для ўсіх пяці пялёсткаў, гэтак жа накладваем іх у сярэдзіне адзін на адзін.

4 Бяром крыху мыльнай сумесі, заліваем кіпенем, размешваем. Мыльную ваду наліваем у бутэльку з прадзіраўленай, як друшляк, накрыўкай, і з гэтай бутэлькі паліваем кветачку спераду. Зверху накрываем тоненькай плёнкай і таксама паліваем мыльнай вадой.

5-6 Акуратна разгладжваем кветку спачатку лёгкімі рухамі, каб малюнак не ссунуўся. А потым, калі ён ужо крыху зафіксуецца, больш моцнымі. Пераварочваем кветку і разгладжваем з іншага боку. Не забывайцеся прыбіраць лішкі мыла льняным ручніком. Потым пузырчаты поліэтылен, на якім вы валіце, разам з кветкай трэба скруціць у трубачку, загарнуць у ручнік і крыху пакачаць на стале. Гэта дасць невялікую ўсадку вырабу і лепш змацуе варсінкі лямцу паміж сабой.

7 Лямец — вельмі падатлівы матэрыял, яму можна надаць абсалютна любую форму. Калі вы будзеце адчуваць, што кветка амаль гатовая, трэба пачынаць фарміраваць сярэдзінку — невялічкае паглыбленне, куды потым можна будзе прымацаваць пацерку ці звалены шарык. Для гэтага трэба нацягнуць кветку на вялікі ці ўказальны палец, замацаваць кветку ў такім становішчы і расправіць пялёсткі.

8 Кветка гатовая. Цяпер вы самі можаце вырашыць, як яе выкарыстоўваць далей.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.46	21.29	16.43
Віцебск —	4.28	21.26	16.58
Магілёў —	4.36	21.19	16.43
Гомель —	4.41	21.07	16.26
Гродна —	5.03	21.43	16.40
Брэст —	5.12	21.35	16.23

Месяц

Маладзік 2 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандры, Фаіны, Хрысціны, Юліі, Андрэя, Багдана, Давыда, Дзяніса, Паўла, Пятра.*

К. *Ангеліны, Камілы, Марыі, Марыеты, Ксаверыя, Лявона, Фелікса.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Садовы інструмент для абразання сучка, сухіх галінак, фарміравання кроны

								3
3		6			9			7
	2		8		3	1	9	
		9	6	2				
		4	1		8	2		
				7	4	6		
	9	5	2		6		7	
7			5			4		2
2								

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

2	4	1	3	8	7	9	6	5
7	6	3	5	9	1	4	8	2
8	9	5	2	4	6	3	7	1
5	3	2	9	7	4	6	1	8
6	7	4	1	3	8	2	5	9
1	8	9	6	2	5	7	3	4
4	2	7	8	5	3	1	9	6
3	5	6	4	1	9	8	2	7
9	1	8	7	6	2	5	4	3

АДКАЗЫ

На сканворд + судоку

Па гарызанталі: Чашкі. Сарафан. Чара. Аніс. Мур. Ліана. Маіс. Абзац. Нанадраст. Ана. Ідра. Акцыя. «Уаін». Леў. Ядро. Сумо. Нагі. Аўгіт. Амар. «Ага.» Накідка. Сеагад. Эпаха. На прадукт. Кампас. Ратан. Шарм. «Спартак». Астана. Мармур. Аліібі. Бра. Сакі. Рыса. Гаўна. Аймак. Нажніцы. Тора. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

ЗАМОР'Е

Падрыхтаваў Іван КУПРАВАС.

ЗА 500 ЕЎРА МОЖНА БУДЗЕ ДАВЕДАЦЦА АБ СВАЁЙ СМЕРЦІ?

Брытанскія ўрачы распрацавалі тэст для вымярэння працягласці жыцця. Навінка паступіць у продаж ужо да канца гэтага года.

Іспанская кампанія Life Length распрацавала новы тэст крыві, які можа прадказаць, як доўга пражыве чалавек. Аналіз заснаваны на вымярэнні «хуткасці» старэння. Навінка, коштам каля каля 500 еўра, паступіць у продаж у Вялікабрытаніі ўжо ў канцы гэтага года, піша брытанская газета The Independent.

Тэст прадугледжвае даследаванне важных структур на канцах храмасом чалавека — так званых целамер, якія навукоўцы лічаць дакладнымі індыкатарамі хуткасці старэння. Навукоўцы заяўляюць, што з дапамогай вымярэння даўжыні целамер можна вызначыць, большы «біялагічны век» чалавека, чым яго пашпартны век, або меншы. Калі целамеры становяцца занадта кароткімі, клетка перастае дзяліцца і гіне. Гэта, у сваю чаргу, паскарае працэс старэння. Такім чынам, па памерах целамер можна вызначыць, колькі прыкладна гадоў адведзена чалавеку. Хоць з дапамогай тэста нельга прадказаць дакладную колькасць гадоў, адведзеных чалавеку, даследчыкі спадзяюцца, што ён атрымае шырокае распаўсюджванне на працягу бліжэйшых 5—10 гадоў. Зрэшты, як лічыць прэзідэнт Агульнанацыянальнай асацыяцыі генетычнай бяспекі Аляксандр Баранаў, распрацоўка Life Length — гэта не што іншае, як спроба зарабіць грошы на адкрыцці. Разам з тым, шэраг іншых адмыслоўцаў лічаць, што новая тэхналогія адкрые скрыню Пандоры. Рэакцыя людзей, якія даведаюцца, што ім засталося жыць нядоўга, будзе непрадказальнай, адзначаюць яны. Акрамя таго, асцерагаюцца скептыкі, страхавыя кампаніі прымусяць кліентаў праходзіць тэст, перш чым выдаваць поліс.

АХ, ГЭТЫЯ МОДНЫЯ ЧАРАВІКІ...

Не, гэта не аўтэнтычны нацыянальны мексіканскі абутак, гістарычныя перыпетыі да ўзнікнення такога ніякага стаўлення не маюць. Нягледзячы на ўсю маразматычнасць з'явы, яна ўсё больш заваёўвае сэрцы і ногі маладых каўбояў, якія не толькі выхваляюцца адзін перад адным падоўжанымі па самае «не хачу» наскамі, але і працягваюць «гонку падаўжэнняў» далей.



Мода на доўгія насы пачалася не так даўно — усяго год таму ў паўночным штаце Мексікі Сан Луіс Патосі, у горадзе Матэхуала — але імгненна заваявала месца пад сонцам і пражэктарамі танцавальных клубаў і іншых забаўляльных устаноў. Спачатку гэта было нявіннае падаўжэнне наскоў на пару сантыметраў для вялікіх «пантоў». Але вельмі хутка тэндэнцыя выйшла з-пад кантролю розуму, ператварыўшыся ў тупое нарошчванне «пераду». Хадзіць у іх яшчэ больш-менш можна, але танцаваць — гэта дурасць тая яшчэ. Мусіць, танцы а-ля «гуарачэра» (Guarachero) вельмі забаўна глядзеліся б у фармаце «танцуючых галоў». Але там фармат першапачаткова гумарыстычны, а тут сур'ёзныя мексіканскія хлопцы прэтэндуюць на самавітасць і вагу ў грамадстве, а паводзяць сябе як дзеці. Уласна кажучы, старэйшае пакаленне так да іх (і насоў і іх носьбітаў) ставіцца як да смешнай дурасці. Але моладзь яна для таго і ёсць — «перашалее» і супакоіцца. Толькі мода на «гуарачэра» наўрад ці сыдзе ў нябыт — заўсёды знойдуцца дзівакі, якія здзіўляюць суседзяў чым заўгодна, толькі не розумам. Бо ўявіце сабе — чэмпіянаты пачалі праводзіць! Па даўжыні насоў! Во як!

ВУСЫ І БАРАДУ НАКРУЦІЦЬ І ПІВА ПАПІЦЬ

Нядаўна ў нарвежскім горадзе Тронхейм сапраўдныя мужыкі мераліся вусамі і бародамі. Там завяршыўся чарговы чэмпіянат свету па самых арыгінальных бародах і вусах 2011 года, які праводзіцца адзін раз у два гады.

Эльмар Вайсер.

Немец Дытэр Безух — пераможца ў катэгорыі «Вольны стыль».

Амерыканец Бюрке Кені — «Натуральная барада ў спалучэнні з вусамі».

«Галоўны сэнс чэмпіянату не ў канкурэнцыі, якая проста бессэнсоўная, а ў атрыманні задавальнення ад сузірання і піва!» — кажа сакратар нарвежскага клуба-арганізатара чэмпіянату вусачоў Олі Ёхан. У спаборніцтвах прынялі ўдзел 163 барадачы з 15 краін свету: ЗША, Швейцарыі, Бельгіі, Канады, Германіі, Італіі, Швецыі, Нарвегіі, Ліхтэнштэйна, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Аўстрыі, Даніі, Фінляндыі і Нідэрландаў. Расліннасць кожнага ўдзельніка ацэньвалі па 17 катэгорыях: 6 катэгорый для вусоў — натуральныя, ангельскія, а-ля Сальвадор Далі, вугорскія, імператарскія і вольнай формы; 5 катэгорый для вялікіх бародаў — натуральныя, натуральныя ў спалучэнні з вусамі, а-ля Вердзі, а-ля Гарыбальдзі і вольнай формы; 6 катэгорый для маленькіх бародак — натуральныя, кітайскія, імператарскія, гвардзейскія, бакенбарды і вольнай формы.

47-гадовы Эльмар Вайсер з Германіі, які працуе цырульнікам, стаў галоўным пераможцам чэмпіянату (ужо трэці раз запар!). Яго прызналі ўладальнікам лепшых барады і вусоў. «Калі мая барада не выкладзена як след, то яна дастае да пояса!» — выхваляецца чэмпіён-барадач.

КАРАЛЕЎСКІЯ БЫКІ ПРАДКАЗАЛІ ДРЭННЫ ЎРАДЖАЙ



Камбаджыйскія каралеўскія быкі прадказалі краіне дрэнны ўраджай рысу.

Старажытная цырымонія, якая праводзіцца перад пачаткам сезону дажджоў, адбылася ў парку ў каралеўскага палаца ў прысутнасці тысяч гледачоў; кіраваў цырымоніяй кароль Нарадом Сіянук. Спачатку сімвалічна быў узараны невялікі кавалак зямлі. Затым двух быкоў падвялі да сямі страў, у якіх былі рыс, кукуруза, бабы, кунжут, сена, вада і рысавая гарэлка. Быкі сталі есці толькі кукурузу і бабы, на падставе чаго галоўны прыдворны астролаг зрабіў выснову, што гэтыя культуры добра ўродзяцца. Астролаг не стаў адмыслова тлумачыць, што гэта значыць для ўраджаю рысу, аднак сярод прымхлівых камбаджыйскіх фермераў ужо пачалася паніка.

МЯККІ І ВЕЛЬМІ ДАРАГІ

У 1860 годзе індыйскі прывіцель, магараджа Бародa Кхандэ Рао замовіў дыван, які намерваўся падарыць для ўпрыгожвання магільні прарока Мухамеда ў Медыне. Гэты пышны шаўковы дыван, аздоблены смарагдамі, сапфірамі і дыяментамі, вышыты жамчужынамі, якіх было больш чым два мільёны. На кожны квадратны дэцыметр дывана, паводле адзнак адмыслоўцаў, прыходзіцца прыкладна па 5000 жамчужын і пацерак. Самы дарагі дыван з'яўляецца не толькі сучасным творам мастацтва, але і каштоўным грашовым укладаннем.

Па прычыне раптоўнай смерці магараджы дыван, пакінуты ў яго сям'і, так і не быў паднесены ў дарунак. «Жамчужны дыван» асцярожна захоўваўся ў сям'і да нядаўняга часу. Ён неаднаразова экспанаваўся на выставах: напрыклад, у 1902—1903 гадах у Дэлі, у 1985 годзе ў Нью-Ёрку, у музеі Метрапалітэн. Самы дарагі дыван памерам 1,73 на 2,64 метра і цалкам вышыты каштоўнымі камянямі, быў прададзены ў сталіцы Катара на аўкцыёне Sotheby's за 5 485 000 долараў ЗША. Стартавы кошт пачынаўся з 4,5 млн долараў. На аўкцыёне за права валодаць дыванам змагаліся ўсяго толькі 3 пакупнікі, астатнія ўстрымаліся ад удзелу. Імя новага ўладальніка трымаецца ў строгай тайне. Нягледзячы на тое, што «Жамчужны дыван» пайшоў з лота за суму меншую, чым чакалі арганізатары аўкцыёну, тым не менш, ён пабіў сусветны рэкорд, усталяваны ў 2008 годзе ў Нью-Ёрку на аўкцыёне Christie's пры продажы старадаўняга персідскага дывана. І цяпер «Жамчужны дыван», створаны ў Індыі ў пазамінулым стагоддзі, — гэта самы дарагі дыван у свеце.

Дзве даты

31 мая

1919 год — па ініцыятыве І. Луцкевіча распачала сваю працу Віленская беларуская гімназія, адна з першых сярэдніх навучальных устаноў у Заходняй Беларусі. У будынку гімназіі быў арганізаваны Беларускі прытулак для дзяцей-сірот, у які траплялі дзеці з-пад Вільні, з Ашмяншчыны, Гродзеншчыны, Навагрудчыны. Прытулак не толькі даваў ім магчымасць існаваць, але і стварыў перспектыву навучання на роднай мове. Акрамя беларусаў, тут вучыліся рускія і яўрэі. Вялікая роля ў фарміраванні светапогляду вучняў належала І. Луцкевічу, які выкладаў беларусазнаўства і краязнаўства, звяртаючы асаблівую ўвагу на патрыятычнае выхаванне. У гімназіі дзейнічалі вучнёўскія самадзейныя гурткі (літаратурны, драматычны, музычны, мастацкі), быў духавы аркестр, хор пад кіраўніцтвам Р. Шырмы, бібліятэка і вучнёўскі кааператыў. Вучні выдавалі друкаваныя і рукапісныя часопісы, насценную газету.

1868 год — у ваколіцах Парыжа, у парку Сен-Клод, адбылася першая ў свеце велагонка. Працягласць трасы складала 1200 метраў. Пераможцам стаў англічанін Джэймс Мур. А ўжо праз год прайшла першая гонка паміж гарадамі Руан і Парыж працягласцю 133 кіламетры, у якой перамог той жа Дж. Мур (спартыўны веласіпед тады важыў 73 кг). Сёння велагонка «Тур дэ Франс» — адно з самых захапляльных спаборніцтваў.

Цытата дня:

«Дружбу, якая даецца за грошы, а не дасягаецца веліччу душы і высакародствам,, можна купіць, але нельга ўтрымаць».

Нікола Макіявелі (1469—1527), італьянскі палітычны мысліцель, гісторык і пісьменнік.

АДЗЕННЕ ДЛЯ ХРЫШЧЭННЯ НОВАНАРОДЖАНАГА

Патрабаванні, якія прад'яўляліся да адзення нованароджанага, у якім ён будзе пасвечаны ў таінства веры і атрымае хрэснае, ці царкоўнае, імя.

- Хрысцільны ўбор шылі з новай, абавязкова з белай (светлай) тканіны, упрыгожваючы яго карункамі, гафтам. З чырвоных нітак плялі пояс-спавівальнік.
- Адзенне, у якім хрысцілі першынца, бацькі больш не выкарыстоўвалі — каб захаваць і перадаць яго чарговаму дзіцяці ўжо ў дзень яго хрышчэння. У народзе былі глыбока перакананы, што ў гэтым выпадку дзеці будуць жыць у любові і згодзе.
- Калі грудное дзіця паміралa, яго хавалі ў той адзежы, у якой хрысцілі.

Залатое правіла народнай культуры:

- калі жадаеце, каб вашы дзеці, а потым іх дзеці былі дружнымі, не аддавайце дзіцячыя рэчы, цацкі чужым людзям, няхай яны пераходзяць «па спадчыне» вашым сваякам. Старыя дзіцячыя рэчы і адзенне нясуць у сабе станоўчую энергетыку і збліжаюць людзей;
- катэгарычна забараняла прадаваць рытуальнае адзенне (вясельнае, хрысцільнае, «прыгатаванае на смерць», г.зн. пахавальнае).

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Прыходзіць мужык у краму, дастае пачак грошай і звяртаецца да прадаўца:

— Так, вось гэта аранжавае, што такое?

— Гэта апельсіны.

— Узважце мне кілаграмаў 15. Толькі кожны апельсін запакуйце ў фольгу і чырвонай стужачкай перавяжыце.

— Добра, што яшчэ?

— А гэта што такое сіняе?

— Гэта сліўы.

— Мне кілаграмаў 20 узважце, кожную сліву ў фольгу загарніце і стужачкай перавяжыце. А гэта што такое?

— Гэта разынкі, але яны не прадаюцца

☺

Па вялікім рахунку, без аўтамабіля ніяк не абысціся толькі ў наступных сітуацыях: пры паездцы на сэрвіс, на запраўку і на шынамантаж. Ва ўсіх астатніх выпадках можна абысціся без яго.

☺

Камісія прымае новы панэльны дом. Вырашылі праверыць гукаізаляцыю. Два члены камісіі разышліся ў суседнія кватэры. Адзін праз сцяну крычыць:

— Ты мяне чуеш?!

— Не гарлапань. Я цябе бачу.

☺

Еўрапейскія студэнты збіраюць на навучанне. Нашы — на сесію.

☺

— Як справы на працы?

— Выжываю паціху...

— Усё так дрэнна?

— Так, за апошні месяц выжыў усяго аднаго начальніка...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2544. Нумар падпісаны ў 19.30 31 мая 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12